

КУЗНЯ ГЕНІЯЎ 5

ДЫСТАНЦЫЙНЫЯ МЕДПАСЛУГІ: ІСНУЮЧЫЯ І БУДУЧЫЯ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

31 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 211 (30091)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, сёлета вынікі сезона здабычы торфу нядрэнныя. У Беларусі было здабыта больш за 2,2 млн тон. Гэтага дастаткова для задавальнення патрэбы ўнутранага рынку краіны ў вытворчасці тарфяной прадукцыі».*

# «Арэлі» здароўя



У Мінскім гарадскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі аказваюць дапамогу пацыентам ва ўзросце ад шасці месяцаў да васямнаццаці гадоў, выкарыстоўваючы пры гэтым сучаснае абсталяванне і метадыкі. Напрыклад, гэты апаратна-праграмны комплекс «Крысаф», падобны на вялікія арэлі, з выкарыстаннем віртуальна-гульнявога асяроддзя спрыяе фарміраванню правільнага рухальнага стэрэатыпу ў дзяцей з парушэннем паходкі з-за паражэння цэнтральнай нервовай сістэмы. А кіруюць гэтым абсталяваннем галоўны ўрач медустановы Аляксандр ЯКАЎЛЕЎ і загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Леанід КАВАЛЕВІЧ.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

• Малы і сярэдні бізнес за студзень — верасень унёс у бюджэт Гродзенскай вобласці больш за Br500 млн.



• **БелАЗ да канца года паставіць 10 газавых самазвалаў у Кузбас.**

• Больш за 9 тысяч дрэў і каля 150 тысяч кустоў высадзяць восенню ў Мінску.

• **Беларускія прадпрыемствы нафтахімічнага комплексу прапанавалі прадукцыю на выставе ў Маскве.**



• Беларусы заваявалі 18 медалёў на маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках.

• **Амаль 200 прызыўнікоў Гомельскай вобласці адправіліся на вайсковую службу.**

• Аб'ём тэрміновых рублёвых дэпазітаў фізічных асоб у верасні павялічыўся на 1,9 працэнта да Br7,4 млрд.

Будзьце ў курсе!

## ВЫРАСТУЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕНСІІ, НАДБАЎКІ ПЕНСІЯНЕРАМ, ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ

**Што мяняецца з 1 лістапада?**



**З заўтрашняга дня змяняюцца памеры бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ). А разам з ім вырастуць розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ад памеру БПМ. Такім чынам, павялічацца дапамогі на дзяцей, павышэнні да пенсій, даплаты і надбаўкі пенсіянерам з 75 гадоў і старэйшым, сацыяльныя пенсіі, дапамогі па догляду інваліда I групы ці асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.**

### БПМ павялічваецца да 367,79 рубля

На перыяд з 1 лістапада 2023 года да 31 студзеня 2024 года зацверджаны яго новыя памеры ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах.

СТАР. 2

Гасцёўня «Звязды»

## «Нават у эпоху глабальнай лічбавізацыі ўніверсітэцкая адукацыя немагчыма без кнігі»

**Інтэрв'ю з рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Юрыем ГОЛУБЕВЫМ**



**У самым канцы ліпеня рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна прызначаны кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Юрый ГОЛУБЕЎ, які да гэтага працаваў прарэктарам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Значыць, літаральна праз некалькі дзён Юрый Пятровіч будзе адзначаць сімвалічную дату — 100 дзён на новай пасадзе. Напярэдадні карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з новым рэктарам, распытала пра першыя ўражанні і першыя крокі на новай рабоце, пра погляд на далейшае развіццё навучальнай установы. Аб гэтым і не толькі — у сённяшнім інтэрв'ю.**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



З першых вуснаў

# «Трэба павялічваць тавараабарот з Кыргызстанам»

## І выпрацоўваць краінавыя планы супрацоўніцтва з постсавецкімі дзяржавамі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі. Эрмек Ібраімаў завяршае сваю дыпламатычную місію ў нашай краіне. «Не ведаю, чым вам так Беларусь не дагадзіла — збіраецеся з'язджаць», — пажартаваў Прэзідэнт. Ён выказаў спадзяванне, што чатыры з паловай года, праведзеныя ў Беларусі, будуць добрай прыступкай у кар'еры Эрмека Ібраімава. «Галоўнае, каб у вас засталіся добрыя ўспаміны аб нашай Беларусі. Мы людзі добразычлівыя, такія як кіргізы, гасцінныя. Таму вы будзеце добрым словам успамінаць праведзеныя ў Беларусі гады вашай дыпламатычнай службы. Мы вельмі спадзяёмся, што, дзе б вы ні працавалі ў будучыні, будзеце па-сапраўднаму нашым чалавекам, беларускім, будзеце прасоўваць інтарэсы Беларусі абавязкова ў інтарэсах Кыргызстана», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што часта думае пра ўзаемадзеянне Беларусі з постсавецкімі рэспублікамі. «І на прыкладзе Кыргызстана звычайна прыходжу да высновы, што мы супрацоўнічаем з рэспублікамі «як бог на душу пакладзе». Нешта засталося ад савецкага перыяду, напрыклад, закуплялі мы ў вас насенне цукровых буракоў і працягваем гэта рабіць, таму што нас якасць задавальняе. Але да таго, каб выпрацаваць пастаянны план, дарожную карту, як модна цяпер гаварыць, супрацоўніцтва Беларусі з рэспублікамі былога Савецкага Саюза (тымі, якія хочуць з намі супрацоўнічаць), мы так і не падышлі», — сказаў ён. Пры гэтым, як заўважыў беларускі лідар, падобныя дакументы распрацоўваюцца па ўзаемаадносінах з іншымі дзяржавамі, напрыклад, з краінамі далёкай дугі. Па некаторых краінах прымаюцца асобныя рашэнні, напрыклад, дэкрэты Прэзідэнта па Расіі, Кітаі і гэтак далей.

«А гэтыя рэспублікі, з аднаго боку, і так нашыя, мы з імі заўсёды наладзім адносіны, а з іншага боку, план такі патрэбен. І нам у Міністэрстве замежных спраў трэба мець краінавыя планы ўзаемаадносін, асабліва з Кыргызстанам. У нас ёсць што прапанаваць кыргызскай дзяржаве. У іх ёсць што нам трэба. І такія сувязі абавязкова павінны быць», — падсумаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тавараабарот паміж Беларуссю і Кыргызстанам складае амаль 170 мільёнаў долараў за апошні год. Па яго словах, паміж краінамі гэта нішто. Беларусь мае значна вышэйшы тавараабарот з многімі рэгіёнамі Расіі. «Таму з Кыргызстанам тавараабарот нам трэба павялічваць. Калі вы будзеце служыць далей у Міністэрстве замежных спраў Кыргызстана ці будзеце недзе працаваць, памятайце пра гэта, падкажыце, парайце, мы будзем зыходзіць з гэтага», — папрасіў Прэзідэнт. Па яго словах, пастаўкі неабходнай тэхнікі і абсталявання, сумесныя вытворчасці ў Кыргызстане могуць быць больш актыўнымі, чым ёсць. Цяпер там рэалізоўваюцца кааперацыйныя праекты па сумеснай вытворчасці ліфтавага абсталявання і трансфарматараў. «Мы можам усё вырабляць у вас і навучаць тэхналогіям вашых людзей, тэхналогіям, якіх вы не мелі раней і па гэтых жа трансфарматарах, ліфтах, трактарах, аўтамабілях і гэтак далей. Вы ведаеце, што мы можам зрабіць. І для Кыргызстана ўзровень тэхналагічнай аснашчанасці краіны, як Беларусь, — дастаткова высокі ўзровень. Мы гатовы дзяліцца гэтымі тэхналогіямі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што цяпер у Кыргызстане тэхналогіі запатрабаваны, і беларусы гатовы імі падзяліцца.

### У тэму



У размове з журналістамі Эрмек Ібраімаў прызнаўся, што пакідае Беларусь з некаторым сумам. «За тыя чатыры з паловай года, што правёў тут, я знайшоў шмат сяброў і палюбіў вашу краіну. Я падзяляю меркаванне аб тым, што Беларусь немагчыма не палюбіць. Яе сапраўды немагчыма не палюбіць. У будучыні, безумоўна, я буду рабіць усё магчымае, каб і надалей развіваць адносіны паміж Кыргызстанам і Беларуссю», — сказаў ён.

Галоўным дасягненнем за чатыры з паловай года сваёй дыпламатычнай службы ў Беларусі Эрмек Ібраімаў лічыць тое, што ўдалося ўтрымаць пазітыўную дынаміку развіцця гандлёва-эканамічных адносін. Па яго словах, сёлета тавараабарот паміж Беларуссю і Кыргызстанам можа перавысіць 200 мільёнаў долараў. Акцэнт у супрацоўніцтве будзе зроблены на прамысловую кааперацыю. У прыватнасці, у транспартна-лагістычнай сферы, што сёння вельмі актуальна для Кыргызстана. Цяпер у краіне будуецца чыгунка, якая павінна звязаць Кітай, Кыргызстан і Узбекістан.

«З Беларускай чыгункай цяпер вядзём работу па праектаванні некаторых участкаў гэтага шляху. Беларусь мае вялікі вопыт у гэтай сферы. А самае галоўнае — Беларусь мае магчымасці праектаваць і ажыццяўляць значную частку падрадных работ. У Беларусі выдатна пастаўлена сістэма кіравання чыгункай, і гэта нас на сёння цікавіць больш за ўсё», — адзначыў дыпламат.

Эрмек Ібраімаў падкрэсліў, што блізкасць Беларусі і Кыргызстана кіламетрамі не мераецца. Па яго словах, у Кыргызстане вельмі добра ведаюць Беларусь. Таму, як адзначыў дыпламат, у адносін дзвюх краін вялікі патэнцыял.

«Словам, вы добра вывучылі Беларусь за гэты час. Калі будзеце і надалей блізка да гэтай работы, я прашу не забывацца на тое, што мы можам, якія ў нас магчымасці для таго, каб прапанаваць кіргізскаму народу», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Эрмек Ібраімаў падзякаваў кіраўніку дзяржавы за магчымасць сустрэчы. «Для мяне асабіста гэта было важна — зазірнуць да вас, далажыць аб тым, што ўдалося зрабіць за чатыры з паловай года, перад тым як паеду ў Бішкек», — сказаў ён. Ён падкрэсліў, што поўнасцю падзяляе меркаванне Прэзідэнта наконт тавараабароту паміж Беларуссю і Кыргызстанам. Па яго словах, калі паглядзець на абсалютныя лічбы, яны здаюцца не такімі ўжо і вялікімі. Але, па словах Эрмека Ібраімава, у адносных паказчыках праглядаецца пазітыўная тэндэнцыя да нарошчвання ўзаемнага гандлю. І гэта, па словах дыпламата, выклікае аптымізм.

«Вы хочаце сказаць, што за апошнія тры гады ў 2,5 раза тавараабарот мы павялічылі? — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта праўда».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ВЫРАСТУЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕНСІІ, НАДБАЎКІ ПЕНСІЯНЕРАМ, ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такім чынам, бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 367 рублёў 79 капеек, што на 0,9 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2023 года.

Памер бюджэту пражытачнага мінімуму (у цэнах верасня 2023 года) для працаздольнага насельніцтва цяпер складае 405 рублёў 27 капеек, пенсіянераў — 273 рублі 26 капеек, дзяцей да трох гадоў — 237 рублёў 34 капейкі, дзяцей ад трох да шасці гадоў — 325 рублёў 11 капеек, дзяцей з шасці да 18 гадоў — 393 рублі 34 капейкі.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 лістапада 2023 года аўтаматычна перагледжаны ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей; павышэнні да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў; даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту; сацыяльныя пенсіі.




### Змяняюцца выплаты пажылым грамадзянам

З 1 лістапада павялічацца «ўзроставыя» даплаты да пенсій, атрымальнікамі якіх у краіне з'яўляюцца больш за 512 тысяч чалавек ва ўзросце 75 гадоў і старэйшых.

Памер гэтых выплат для пажылых людзей ва ўзросце 75—79 гадоў складзе 68,96 рубля, 80 гадоў і старэйшых (з улікам надбаўкі на догляд) — 137,93 рубля, а пры наяўнасці інваліднасці I групы — 183,9 рубля.

Расходы на іх фінансаванне ў лістападзе складуць каля 55,5 мільёна рублёў, у тым ліку каля 0,6 мільёна рублёў — на павышэнне ў сувязі з ростам БПМ. У цэлым выдаткі на «ўзроставыя даплаты» ў 2023 годзе складуць каля 641 мільёнаў рублёў.

Дапамога па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, пры ажыццяўленні догляду за адной асобай складае цяпер 367,79 рубля, за двума і больш асобамі — 441,35 рубля.

### Павышаюцца сацыяльныя пенсіі

Іх памеры складуць для інвалідаў 1 групы, у тым ліку інвалідаў з дзяцінства — 404,57 рубля, інвалідаў з дзяцінства II групы — 349,40 рубля, інвалідаў II групы — 312,62 рубля, інвалідаў III групы — 275,84 рубля.

Для дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў пры першай ступені страты здароўя — 294,23 рубля, другой — 312,62 рубля, трэцяй — 349,40 рубля, чацвёртай — 404,57 рубля. Сацыяльныя пенсіі для мужчын, якія дасягнулі 65-гадовага ўзросту, і жанчын, якія дасягнулі 60 гадоў, складуць 183,90 рубля.

Расходы на іх фінансаванне ў лістападзе запланаваны ў памеры 22,4 мільёна рублёў, у тым ліку 0,34 мільёна рублёў — на павышэнне ў сувязі з ростам БПМ. У цэлым расходы на выплату сацыяльных пенсій інвалідам у 2023 годзе складуць, паводле ацэнкі, 258,3 мільёна рублёў.

### Вырастуць дзяржаўныя дапамогі на дзяцей

З 1 лістапада 2023 года да 31 студзеня 2024 года дзяржаўныя дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей, якія вылічваюцца з БПМ, устанаўліваюцца ў наступных памерах. Аднаразовая пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 БПМ, або 3677,9 рубля. Пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ, або 5149,06 рубля. Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, — 100 % БПМ, або 367,79 рубля.

Штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — 50 % БПМ, або 183,90 рубля. Штомесячная дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаных заканадаўствам (акрамя дзіцяці-інваліда), таксама складае 50 % БПМ, або 183,90 рубля.

На дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады, дапамога складае 70 % БПМ, цяпер гэта 257,45 рубля. Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 з I і II ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў і з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў складае 100 % БПМ, або 367,79 рубля, з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў — 120 % БПМ, або 441,35 рубля. Штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека, складае 70 % БПМ, або 257,45 рубля.

Дапамогамі, якія вылічваюцца з БПМ, у Беларусі ахоплена каля 176 тысяч дзяцей. На іх выплату ў 2023 годзе запланавана 1,5 мільярда рублёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Рэха падзей

# БОЛЬ І ГОНАР СУРАЖСКАГА КРАЮ

**Гарадскі пасёлак Сураж, што знаходзіцца ў Віцебскім раёне, стаў другім населеным пунктам паўночнага рэгіёна пасля Лёзна, які быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта гістарычная падзея адбылася 28 кастрычніка 1943 года, і праз 80 гадоў удзячныя нашчадкі герояў-вызваліцеляў нясуць чырвоныя гваздзікі да падножжаў воінскіх мемарыялаў на Суражчыне.**



Фота БелТА.

Два гады і тры месяцы Сураж знаходзіўся пад фашысцкай акупацыяй. Ужо 10 ліпеня 1941 года жыхары райцэнтра бачылі, як да ракі Каспля набліжаюцца бронетранспарцёры з нямецкімі крыжамі. У будынку райкама партыі размясцілася камендатура, а неўзабаве з'явіліся першыя нямецкія загады. У пачатку 1942-га суражчане былі вымушаны пакінуць родныя мясціны. Страшна ўявіць, што давялося перажыць насельніцтву пад гітлераўскім прыгнётам. Па некаторых гістарычных даных, праз год пасля пачатку вайны ў Суражскім раёне карнікі спалілі 1918 двароў, 16 школ, 8 бальніц. Тысячы лёсаў мірных жыхароў абарваліся на працягу некалькіх гадоў.

Са студзеня 1942-га да снежня 1943 года існавала Суражская партызанская зона, а першы партызанскі атрад пад камандаваннем Міная Піліпавіча Шмырова быў створаны рашэннем Суражскага райкама партыі 5 ліпеня 1941 года. Ужо 12 верасня ён разграміў у райцэнтры нямецкі гарнізон і на працягу трох гадзін утрымліваў пасёлак.

За два месяцы (у жніўні—верасні 1941 года) з-за дзеянняў партызанскага атрада Шмырова немцы страцілі восем аўтамашын, каля 70 салдат, чатыры масты былі ўзарваны, са строю была выведзена тэлефонная станцыя пасёлка Пудоць. А ў ноч з 9 на 10 верасня атрад у 80 партызан разграміў Суражскі гарнізон ворага, вярнуўшыся ў лес са шматлікімі трафеямі: машынамі і матацыкламі. Фашысты ў сваіх рапартах пісалі, быццам на іх напала дзве ці тры тысячы партызан. За галаву «Бацькі Міная» абяцалі ўзнагароду: спачатку — участак зямлі, карову, каня і 10 000 нямецкіх марак, затым «стаўка» вырасла да 20 000 марак, потым — да 50 000 марак. Аднак ніхто яго не здаў.

Страціўшы надзею расправіцца з народнымі мсціўцамі, 19 кастрычніка 1941 года гітлераўцы ўзялі ў заложнікі малалетніх дзяцей камандзіра: Лізу (14 гадоў), Сярожу (10 гадоў), Зіну (7 гадоў), Мішу (3 гады). Іх даставілі ў Сураж, трымалі вязняў у голадзе і холадзе, катавалі і палохалі. Дзеці спачатку крычалі, плакалі, потым перасталі. Старэйшым казалі, што бацьку ўжо злавілі і павесілі, а малодшаму, Мішу, было горш за ўсё — яму ўвесь час ладзілі «вочныя стаўкі» са злоўленымі партызанамі ў надзеі, што Міша пазнае і выдасць тым самым бацьку.

Фашысты абяцалі пакінуць дзяцей жывымі, калі «Бацька Мінай» добраахвотна здасца ў палон. Шмыроў губляўся: ісці на штурм, як прапаноўвалі партызаны, ён не хацеў — Сураж ім было не ўзяць, а менавіта на гэта і разлічвалі фашысты. Спачатку ён хацеў здацца немцам адзін у абмен на жыццё дзяцей, затым вырашыў паклончыць з сабой, спадзеючыся, што немцы не стануць забіваць дзяцей. Але многае вырашыла запіска старэйшай дачкі Лізы, перададзеная Шмырову: «Тата, за нас не хвалюйся, нікога не слухай, да немцаў не ідзі. Калі цябе заб'юць, то мы нямоглыя і за цябе не адпомсцім. А калі нас заб'юць, тата, то ты за нас адпомсціш». 14 лютага 1942 года гітлераўцы расстралялі дзяцей, сястру камандзіра і маці жонкі. У яго больш не засталося родных. Запіску Лізы Мінай усю вайну насіў у кішэні каля сэрца. На тэрыторыі Суражскай сярэдняй школы цяпер узвышаецца помнік у гонар малалетніх ахвяр фашызму, а ўстанова адукацыі носіць ганаровае імя легендарнага камбрыга.

У вызваленні Суража ўдзельнічалі 1189-ы стралковы полк пад кіраўніцтвам Пятра Курэні 358-й стралковай Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі 4-й ударнай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту, 1-я Віцебская партызанская брыгада. Баі за райцэнтр пачаліся 12 кастрычніка. Аднак ён быў вельмі ўмацаваны: вакол — траншэі, кулямётныя гнёзды, драцяныя загароды, замініраваныя дарогі і палі . Больш за два тыдні ішлі баі, толькі раніцай 28 кастрычніка ўдалося прарваць абарону праціўніка і выгнаць яго з гарпасёлка. Немцы адступілі да вёсак Сакольнікі, Мішуткі і замацаваліся ў раёне Вымна — Котава. За вызваленне Суражскага раёна звання Героя Савецкага Саюза пасмяротна ўдастоены Анатоль Углоўскі, Аляксей Томскі, Генадзь Пацёмкін.

Жыхары, якія вярнуліся ў вызвалены Сураж, не пазналі яго: замест дамоў — голыя абгарэлыя коміны, два-тры паўразбураныя замініраваныя будынкі і зямлянкі. Яшчэ доўга ад суседніх вёсак да райцэнтра даляталі варожыя снарады і міны.

Святочныя мерапрыемствы ў раёне, прымеркаваныя да 80-й гадавіны вызвалення Суража ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пачаліся з патрыятычнага аўтапрабегу, пасля кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, моладзь і мясцовыя жыхары ўзялі ўдзел у мітынгу на воінскім мемарыяле, дзе знайшлі свой апошні прытулак каля 400 байцоў.

«Тут і на тэрыторыі нашай краіны ляжаць сотні тысяч байцоў і афіцэраў, партызан і падпольшчыкаў, мірных грамадзян, якія аддалі свае жыцці дзеля нашай свабоды. Вялікі сімвалізм, што з намі нашы сябры са Смаленскай і Пскоўскай абласцей, бо нашы дзяды і прадзеды разам адваёўвалі свабоду гэтых зямель. Сёння амаль не засталося ўдзельнікаў вайны, але жывуць іх удзячныя нашчадкі. Тое, што адбываецца ў нашай краіне, яшчэ раз падкрэслівае, як важны і патрэбны мір. Мы 80 гадоў жывём пад мірным небам, і для нас гэты дзень — не проста дзень вызвалення, а яшчэ адзін урок, як трэба шанаваць і памятаць, якімі пакутамі і болем дастаецца свабода», — адзначыў **кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Напярэдадні падзеі ў Віцебскім раёне прайшла акцыя «Капсула часу», у рамках якой старшыні 15 сельскіх выканаўчых камітэтаў збіралі зямлю з найбуйнейшых воінскіх пахаванняў у сваіх Саветах. Лампады з зямлёй былі прывезены ў Сураж і занялі месца каля Вечнага агню як сімвал агульнай гераічнасці і агульнай памяці.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паўсюль прайшлі пратэсты з-за сітуацыі на Блізкім Усходзе




На фоне заявы Арміі абароны Ізраіля (ЦАХАЛ) аб пашырэнні ваеннай аперацыі ў Газе ў многіх гарадах свету, у тым ліку ў заходніх сталіцах, адбыліся акцыі ў падтрымку Палесціны і за спыненне агню на Блізкім Усходзе. Дэманстрацыя ў падтрымку спынення агню ў зоне палесціна-ізраільскага канфлікту 28 кастрычніка прайшла ў будынку галоўнага вакзала Нью-Ёрка — Гранд-Цэнтрал. Акрамя таго, у Вашынгтоне ў Лафает-скверы каля Белага дома прайшла акцыя з патрабаваннем абмежаваць падтрымку Ізраіля і дамагчыся спынення агню на Блізкім Усходзе. У цэнтры Лондана да 100 тысяч чалавек узялі ўдзел у акцыях у падтрымку Палесціны. Каля 4 тысяч чалавек прынялі ўдзел у несанкцыянаванай маніфестацыі ў падтрымку Палесціны ў Парыжы. У Берліне ў ноч з 27 на 28 кастрычніка прайшло некалькі несанкцыянаваных акцый. Шматтысячная акцыя адбылася ў Афінах у парку Элефтэрыяс. Тысячы людзей выйшлі на маніфестацыю ў іспанскім Мадрыдзе. У розных гарадах Італіі адбыліся мітынгі ў падтрымку міру на Блізкім Усходзе.

Акцыі таксама прайшлі ў Капенгагене (Данія), Стакгольме (Швецыя), Осла (Нарвегія), Цюрыху (Швейцарыя) і ў іншых гарадах свету. Маштабны мітынг у падтрымку Палесціны прайшоў у Стамбуле на тэрыторыі закрытага аэрапорта Атацюрка. Падчас акцыі выступіў турэцкі лідар Рэджэп Таіп Эрдаган. Прэзідэнт Турцыі ацаніў колькасць удзельнікаў мерапрыемства ў 1,5 млн чалавек. Тысячы чалавек са сцягамі Палесціны выйшлі на мітынг у цэнтры Сіднея. У сталіцы Лівана Бейруце таксама прайшла масавая акцыя салідарнасці з палесцінцамі ў Газе. У ноч на 28 кастрычніка шматтысячная вулічная акцыя ў падтрымку народа Палесціны прайшла ў Тунісе. У сталіцы Іарданіі Амане некалькі соцень пратэстоўцаў зладзілі беспарадкі ў раёне Рабіе, дзе знаходзіцца пасольства Ізраіля. Шматтысячны марш у падтрымку народа Палесціны прайшоў у венесуэльскай сталіцы — Каракасе. У сталіцы Інданезіі Джакарце прайшла дэманстрацыя каля пасольства ЗША ў абарону сектара Газа. Прыхільнікі Ізраіля таксама збіраліся ў мінулыя выхадныя на мітынгах. Генасамблея ААН 27 кастрычніка прыняла рэзалюцыю арабскіх краін з заклікам да неадкладнага перамір'я ў зоне палесціна-ізраільскага канфлікту, які вядзе да спынення баявых дзеянняў. Дакумент падтрымалі 120 краін, 14 дзяржаў, уключаючы ЗША і Ізраіль, былі супраць, 45 устрымаліся. Агенцтва ААН заяўляе аб катастрафічнай сітуацыі ў сектары Газа з-за дэфіцыту ежы, вады, лекаў і паліва. Папа Рымскі заклікаў да міру ў «свеце, які знаходзіцца ў вялікай небяспецы», і перасцярог ад «глупства вайны, якая сее смерць і знішчае будучыню».

### Звыш 40 чалавек сталі ахвярамі ўрагану «Оціс» у Мексіцы



Па меншай меры, 43 чалавекі загінулі ў выніку ўрагану «Оціс», які прайшоў па мексіканскім штаце Герэра. Пра гэта паведаміла CNN са спасылкай на губернатара рэгіёна Эвелін Сальгаду Пінеду. Урагану, які дасягнуў берагоў Мексікі, прысвоілі пятую (максімальную) катэгорыю. Пінеду дадала, што мексіканскім уладам удалося выратаваць 340 чалавек. На дапамогу пацярпелым адправілі каля 10 тысяч вайскоўцаў. Паводле папярэдняй ацэнкі, пашкоджанні атрымалі звыш 220 тысяч дамоў і 80 працэнтаў атэляў рэгіёна. З-за паваленых дрэў і апоўзняў частка дарог перакрыта. Міжнародны аэрапорт Акапулька таксама атрымаў пашкоджанні. Паведамляецца, што «Оціс» стаў самым моцным штормам у штаце Герэра за ўсю гісторыю назірання.

Надвор'е

## НЕ БАБІНА ЛЕТА, АЛЕ ЎСЁ Ж...

### На працягу тыдня пацяплее да 17 градусаў

**Кастрычнік быў не занадта «мяккі», гэта пасля анамальна цёплага верасня. А цяпер надвор'е «згадала», што ў нас пацяпленне, і зноў уключыла цяпло.**

А ў мінулыя выхадныя пераважала пахмурнае і халоднае надвор'е. Паводле апошніх звестак, сярэднясутачная тэмпература паветра па краіне яшчэ ўчора з раніцы знаходзілася ў межах ад мінус 1 градуса да плюс 8, што ў асноўным на 1—5 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Але ўжо ў панядзелак на тэрыторыю нашай краіны пачынае паступаць цёплая паветраная маса з паўднёвага захаду Еўропы. Тэмпературны фон павышаецца і ў апошні дзень кастрычніка будзе некалькі вышэйшым за кліматычную норму. Як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, лістапад прымае эстафету кастрычніка з цёплага, але дажджлівага надвор'я.

У аўторак ноччу будзе пераважна без ападкаў. Раніцай і днём у многіх раёнах пройдуць невялікія дажджы. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—11 градусаў, удзень — 11—17 градусаў, на паўднёвым захадзе да 19 цяпла.

У чацвер і пятніцу за надвор'е ў Беларусі пачне адказваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму абыдзецца пераважна без ападкаў, толькі ў ноч на чацвер з адыходзячым франтальным раздзелам па ўсходзе краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны будзе слабы туман, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — ад плюс 5 па паўночным усходзе да плюс 13 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

У пятніцу таксама будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 градусаў вышэй за нуль, па ўсходзе пры праясненнях — да мінус 2 градусаў. Днём слупок тэрмометра па паўночным усходзе краіны падымецца да плюс 5, па паўднёвым захадзе — 13 цяпла.

Згодна з папярэднім прагнозам, у гэтыя выхадныя ўлада над надвор'ем зноў пяройдзе да атмасферных франтоў. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць, і кароткачасовыя дажджы будуць адзначацца ў многіх раёнах краіны. Разам з тым шчыльная франтальная воблачнасць будзе перашкаджаць начным замаразкам. Уплыў франтальнага раздзелу, які ссоўваецца праз тэрыторыю нашай краіны, будзе адбівацца і ў нядзелю.

А 4 лістапада, у суботу, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 градусаў па паўночным усходзе да плюс 12 градусаў па паўднёвым захадзе нашай краіны, днём — ад 7 градусаў цяпла ў паўночных раёнах да плюс 15 градусаў у паўднёвых.

У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—11 цяпла, удзень — 9—15 градусаў, на поўдні — да плюс 17.

Там амаль бабіна лета. Амаль. І ненадоўга.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Міжнародны вектар

# БЕЛАРУСЬ ПАДТРЫМЛІВАЕ ІДЭЮ ГАРМАНІЧНАГА І РАЎНАПРАЎНАГА СУІСНАВАННЯ ЎСІХ КРАІН І НАРОДАЎ

## Аб чым міністр абароны казаў на 10-м Пекінскім форуме па пытаннях бяспекі




**Завяршыўся афіцыйны візіт беларускай дэлегацыі на чале з Віктарам Хрэніным у Кітайскую Народную Рэспубліку. Яго асноўным вынікам стала выпрацоўка «дарожнай карты» па развіцці двухбаковага ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Акрамя таго, у ходзе афіцыйнага візіту абмяркоўваліся пытанні сумеснай падрыхтоўкі ваеннаслужачых Узброеных Сіл Беларусі і Народна-вызваленчай арміі Кітая, удзелу кітайскіх калег у конкурсах Армейскіх міжнародных гульняў, якія плануецца правесці на тэрыторыі нашай краіны. Асаблівую ўвагу бакі ўдзялілі ўзаемадзеянню ў галіне падрыхтоўкі ваенных кадраў. Ёсць канкрэтныя дамоўленасці па сумесным удзеле ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі пад эгідай ААН.**

### «Беларусь імкнецца захаваць суверэнітэт»

Пытанні двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва кіраўнік абароннага ведамства Беларусі абмяркоўваў і на сустрэчы з членам Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Кітая, намеснікам Старшыні Цэнтральнага ваеннага савета Кітайскай Народнай Рэспублікі генерал-палкоўнікам Чжанам Юся, і падчас іншых мерапрыемстваў, запланаваных у ходзе афіцыйнага візіту.

Беларуская ваенная дэлегацыя наведала Універсітэт нацыянальнай абароны Народна-вызваленчай арміі Кітая. Віктар Хрэнін азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы адукацыі, паразмаўляў з выкладчыцкім складам, наведаў музей універсітэта і пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей. Дарэчы, навучанне беларускіх і кітайскіх ваеннаслужачых у ваенных навучальных установах Беларусі і Кітая праводзіцца на планавай аснове. У Ваеннай акадэміі нашай краіны прайшлі навучанне звыш 350 кітайскіх вайскоўцаў. У навучальных установах Народна-вызваленчай арміі Кітая атрымала дадатковую адукацыю больш як 80 беларускіх ваеннаслужачых.

Выступаючы на 10-м Пекінскім форуме па пытаннях бяспекі «Сяншань», у якім узялі ўдзел прадстаўнікі ўзроўню міністра абароны з больш як 40 краін свету, Віктар Хрэнін адзначыў, што ў сучасным свеце, які фундаментальна мяняецца, Рэспубліка Беларусь імкнецца захаваць суверэнітэт, права на канструктыўнае ўзаемадзеянне з усімі краінамі. «І мы бачым, што такую пазіцыю падзяляе большасць свабодных дзяржаў планеты, — удакладніў ён. — Разам з тым мы разумеем, што шлях да шматпалярнасці не будзе просты. Трансфармацыя сістэмы міжнародных адносін чакана сутыкаецца з актыўным процідзеяннем прыхільнікаў аднапалярнай мадэлі светаўладкавання. Яны будуць працягваць шукаць новыя магчымасці для захавання свайго дамінавання. І ваенная сіла, на жаль, тут будзе заставацца адным з галоўных аргументаў».

Міністр абароны звярнуў увагу на тое, што мы становімся сведкамі разбурэння сістэмы міжнародных адносін, заснаванай на міжнародным праве. «У першую чаргу ідзе дэмантаж механізмаў кантролю над узбраеннямі, якія ствараліся дзесяцігоддзямі, і падтрымання стабільнасці, — канкрэтызаваў ён. — І калі раней сістэма дагавораў забяспечвала баланс сіл на мінімальным узроўні абароннай дастатковасці, то сёння ўжо нішто не стрымлівае дзяржавы ад рэалізацыі іх агрэсіўных планаў. У Еўропе бескантрольнасць служыць штуршком да новага вітка гонкі ўзбраенняў. Невыпадкова сёння бачная тэндэнцыя па нарошчванні дзяржавамі ваенных бюджэтаў, закупцы наступальных узбраенняў для сваіх войскаў, павелічэнні колькасці войскаў, правядзенні бясконцых вучэнняў каля межаў апанентаў. А ў цэлым паскораная мілітарызацыя планеты павышае верагоднасць развязвання поўнамаштабных ваенных канфліктаў ва ўсіх рэгіёнах свету».

### «Найлепшая вайна — тая, якая не адбылася»

Па словах кіраўніка абароннага ведамства, намецілася небяспечная тэндэнцыя, калі для супрацьдзеяння сваім канкурэнтам на міжнароднай арэне адраджаюцца старыя саюзы дзяржаў, фарміруюцца новыя ваенна-палітычныя блокі, а таксама пашыраюцца функцыі рэгіянальных альянсаў, якія існуюць. Напрыклад, блок НАТА заяўляе аб глабалізацыі сваіх функцый на ўсю планету. На супрацьстаянне з геапалітычнымі канкурэнтамі ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне арыентаваны «Стратэгічны трохвугольнік» ЗША, Японіі і Паўднёвай Карэі. Яшчэ адным саюзам, накіраваным на недапушчэнне збліжэння краін рэгіёна ў рамках АСЕАН, з'яўляецца «Чатырохбаковы дыялог па бяспецы» (QUAD).

Як канстатаваў Віктар Хрэнін, узровень мілітарызацыі, які расце, нічым не абмежаваны, рост ваеннай моцы стварае ў рэгіянальных дзяржаў ілюзію, што ўсе праблемы можна вырашыць сілай. «Логіка тут простая: ва ўмовах трансфармацыі светаўладкавання, калі геапалітычныя цэнтры сілы ўцягнуты ў бескампраміснае супрацьстаянне адзін з адным, лакальны канфлікт не будзе заўважаны міжнароднай супольнасцю, — патлумачыў міністр абароны. — Адпаведна не будзе і рэакцыі з боку міжнародных арганізацый па бяспецы. Варта сказаць, што ў аналагічным ключы думаюць і недзяржаўныя гульцы ў асобе міжнародных тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацый. Яны таксама спрабуюць адваяваць сабе месца ў светапарадку, які фарміруецца, і рэалізуюць гэтыя памкненні ўласнымі ўзброенымі фарміраваннямі». Менавіта па гэтай прычыне, акцэнтаваў увагу генерал-лейтэнант, мы становімся сведкамі актывацыі ачагоў «замарожаных канфліктаў» па ўсім свеце: у Сірыі, ва Украіне, на Блізкім Усходзе.

Беларусь поўнасцю падтрымлівае ідэю гарманічнага і раўнапраўнага суіснавання ўсіх краін, усіх народаў. У гэтай сувязі міністр абароны прывёў старажытную кітайскую мудрасць: «Найлепшая вайна — тая, якая не адбылася». «Падзяляючы такі падыход, Рэспубліка Беларусь ніколі не звязвала сваю будучыню з ваенным вырашэннем міжнародных праблем, — канстатаваў ён. — Мы заўсёды выступалі за рэгуляванне ўсіх спрэчных пытанняў мірным шляхам, лічачы ваенную сілу толькі крайнім сродкам адпору агрэсару. Менавіта таму нам вельмі імпануе кітайская Ініцыятыва па глабальнай бяспецы. Будзем спрабаваць данесці да разважлівай часткі сусветнай супольнасці думку аб непадзельнасці бяспекі, аб згубнасці спроб забяспечыць уласную бяспеку за кошт мілітарызацыі. Зыходзячы з гэтага, заклікаем усе адказныя незалежныя краіны задумацца над перазагрузкай міжнароднай дагаворнай сістэмы, накіраванай на павышэнне транспарэнтнасці ў ваеннай сферы, захаванне парытэту ваенных сіл з адначасовым раззбраеннем да ўзроўню абароннай дастатковасці».

**Паводле прэс-службы Мінабароны.**

Годная змена

# КУЗНЯ

## Напярэдадні 70-годдзя пазнаёміліся

**Кожны суворавец ведае прымаўку: той, хто не паступіў у суворaўскае вучылішча, павінен радавацца, а хто паступіў — ганарыцца. І з гэтым, як кажуць, не паспрачаешся. Насіць пунсовыя пагоны здольныя далёка не ўсе школьнікі. Сур'ёзная адукацыйная і фізічная нагрузка, дысцыпліна, адсутнасць асабістай прасторы і штодзённага бацькоўскага клопату — вытрымаць асаблівасці навучання з ваенным ухілам могуць толькі мэтанакіраваныя, самастойныя і стойкія падлеткі.**

Вядома, не ўсе з іх даходзяць да фінішу. Адны выпадаюць з дыстанцыі ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя, іншыя не вытрымліваюць нагрузак. Некаторыя ўвогуле перадумваюць звязваць сваё жыццё з ваеннай службай. Аднак працэнт тых, хто адсейваецца ў працэсе навучання, невялікі. Большасць усё ж такі даходзіць да выпускных іспытаў. Практычна ўсе з іх паступаюць у сілавыя ВНУ.

За пяць гадоў навучання ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы ўчарашнія дзеці становяцца дасведчанымі, інтэлігентнымі, самастойнымі хлопцамі. Пераканаліся ў гэтым і карэспандэнты «Звязды», якія наведалі кузню ваенных кадраў напярэдадні яе юбілею.



### Адаптацыя — справа індывідуальная

У суворaўскае вучылішча паступаюць пасля шостага класа. Тут учарашнія школьнікі працягваюць засвойваць навучальную праграму. Акрамя таго, для іх выкладаюцца спецыфічныя прадметы, неабходныя для станаўлення будучых афіцэраў: маладыя людзі вучацца правілам этыкету, спасцігаюць азы бальнага танца і, вядома, ваеннай справы.

Традыцыйна конкурс у Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча вялікі. Колькасць ахвотных апрануць ваенную форму заўсёды пераўвышае магчымасць навучальнай установы прыняць навічкоў. Сёлета ў вучылішча паступіла каля 600 заявак. Па выніках медыцынскага агляду і псіхалагічнага адбору да іспытаў было допушчана каля дзвюх соцень хлопцаў з усёй краіны. У выніку два месяцы таму шэрагі суворaўцаў папоўнілі 104 учарашнія школьнікі. Усе навапечаныя ўладальнікі пунсовых пагонаў мараць аб афіцэрскім званні.

Нягледзячы на тое што першая чвэрць года ўжо завяршылася, нямногія з трэцяй роты, дзе вучацца навічкі, прызвычаіліся да новай абстаноўкі, жыцця па графіку і парадку ва ўсім. Большасці не хапае ўвагі і цеплыні бацькоў.

Як расказвае **памочнік камандзіра трэцяй роты па маральна-псіхалагічнай падрыхтоўцы — псіхолаг роты лейтэнант Вольга ДРАЗДОВА,** менавіта гэтаму аспекту ў адаптацыі навічкоў афіцэрска-выкладчыцкі склад вучылішча ўдзяляе асаблівую ўвагу. «Адаптацыя ў кожнага праходзіць індывідуальна, — адзначае псіхолаг роты. — Хтосьці адаптаваўся на працягу тыдня — і ўпэўнена стаіць у суворaўскім шэрагу, з лёгкасцю ўзаемадзейнічае з таварышамі. Камусьці і пяці гадоў мала, каб прызвычаіцца да абстаноўкі і новага ладу жыцця. У сярэднім адаптацыя ў дзяцей гэтага ўзросту доўжыцца паўгода».

Як паказваюць назіранні выкладчыкаў і афіцэраў, практычна ўсе суворaўцы вельмі прывязаныя да бацькоў. Таму для больш хуткай адаптацыі ім дазваляецца штодзённа падтрымліваць сувязь з роднымі. У вячэрні час выхаванцы вучылішча звязваюцца з імі або па мабільным тэлефоне, або па таксафоне. Пры неабходнасці не забараняецца патэлефанаваць родным і на працягу дня. Калі для таго, каб настроіцца на навучальны працэс, патрэбна пачуць мамін голас, — ніхто не будзе гэтаму перашкаджаць. Аднак у адносінах да старэйшых суворaўцаў такія «плюшкі» не працуюць.

На працягу першай чвэрці навучання для навічкоў прадугледжаны і штотыднёвыя звальняльныя. У суправаджэнні дарослых сваякоў ім дазваляецца пакінуць сцены вучылішча з пятніцы да нядзелі — такая практыка таксама на карысць адаптацыйнаму працэсу.

— Адна з узроставых патрэб сямікласнікаў — аддзяліцца ад бацькоў, — заўважае Вольга Драздова. — Дзецям, якія развіваюцца ў адпаведнасці з узростам, прасцей адаптавацца да новых умоў. Аднак ёсць і тыя, хто вельмі цяжка перажывае расставанне з бацькамі. У такіх выпадках прадугледжана працяглая індывідуальная работа на зніжэнне эмацыянальных праяў. Без гэтага будзе складана самаарганізавацца і вучыцца.

### Звальненне варта заслужыць

Арцемію Алейніку пашанцавала: ён мінчанін, а таму дома бывае кожныя выхадныя. Але так будзе не заўсёды. Магчымасць навед-

# ГЕНІЯЎ І ЯЕ ЮНЫЯ ВЫХАВАНЦЫ

## Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча карэспандэнты «Звязды» з яго навучэнцамі

ваць родных штотыднёва ёсць толькі падчас навучання ў першай чвэрці першага навучальнага года. Пасля звальненне трэба будзе заслужыць. Калі суворавец добра вучыцца і з дысцыплінай у яго ўсё ў парадку, праводзіць суботу і нядзелю дома, за рэдкім выключэннем, ён можа хоць кожны тыдзень.

Упершыню ў суворaўскае вучылішча Арцемій трапіў будучы ў другім класе — разам з бацькамі ён прыйшоў сюды на дзень адкрытых дзвярэй. Мама і тата хацелі, каб ён сам убачыў, што вучыцца ў вучылішча няпроста, а таму свядома зрабіў выбар. Пасля наведвання навучальнай установы жаданне насіць пунсовыя пагоны ў школьніка толькі ўзмацнілася. Тым больш што з самага дзяцінства ён марыць дасягнуць поспехаў бацькі, які з'яўляецца палкоўнікам Узброеных Сіл. Ёсць у чым раўняцца і на дзядуль, афіцэраў запасу.

Арцемій прызнаецца, што першыя два дні ў вучылішчы вельмі сумаваў па доме, родных. Здаралася, што нават плакаў. Аднак ні разу не патэлефанаваў бацькам з просьбай забраць яго дамоў. Цяжэй за ўсё хлопцу было прывычаіцца да распарадку дня. Дома, калі ёсць такая магчымасць, можна даўжэй паспаць, пазней легчы. «Захацеў паесці — пайшоў на кухню, у суворaўскім жа ўсё па раскладзе, — заўважае выхаванец. — Праўда, хутка прызвычайваешся і да гэтага. Тым больш што кормяць нас добра, чатыры разы на дзень. Усяго хапае, нават усё і не з'ядаеш».

З іншымі суворaўцамі Арцемій хутка знайшоў агульную мову. Пасля заканчэння вучылішча ён плануе паступаць на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі.



А вось Іван Лайкоў марыць стаць ваенным урачом. Малады чалавек родам з Магілёва. Аб існаванні суворaўскага вучылішча, якое славіцца сваім прэстыжам, ён даведаўся ад бабулі. Аднак таго, што пачуў, хлопцу было мала — захацелася ўсё ўбачыць на свае вочы. І ў найбліжэйшы дзень адкрытых дзвярэй разам з бабуляй яны прыехалі ў Мінск. «Мне ўсё спадабалася, — згадвае першае ўражанне Іван. — Бабуля сказала, што летам будзем трэніравацца, каб паступіць. Я быў не супраць. Кожную раніцу прачынаўся, вучыўся правільна і хутка засцілаць ложак, бегаў вакол хаты».

Бабуля для Вані — самы блізкі чалавек і найлепшы сябар. Так склалася, што маму і тату суворaўца пазбавілі бацькоўскіх правоў. Увесь клопат аб траіх унуках (у Івана яшчэ ёсць брат і сястра) узяла на сябе бабуля. «Стэлефаноўваемся з ёй кожны дзень, — кажа хлопец. — Яна цікавіцца, як мае поспехі. Я, у сваю чаргу, пытаюся пра брата і сястру».

Іван прызнаецца, што да сур'ёзнай фізічнай нагрузкі, як і да распарадку дня, ён ужо прывыкае. А вось вучоба даецца не так проста. Невыпадкова кожную вольную хвіліну ён бярэцца за падручнікі.

Дарэчы, дзеці-сіроты, а таксама дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, залічваюцца ў суворaўскае вучылішча па-за конкурсам. Такім чынам дзяржава падтрымлівае гэтую катэгорыю юных грамадзян. Таксама без уступных іспытаў у навучальную ўстанову паступаюць выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў пры воінскіх часцях, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, дзеці ваеннаслужачых, прадстаўнікоў іншых сілавых структур, якія загінулі або сталі інвалідамі падчас нясення службовых абавязкаў.

### Кожны суворавец — пад кантролем

Нягледзячы на тое, што вучэбная праграма адпавядае школьнай (за некаторымі выключэннямі), такога паняцця, як «клас», у суворaўскім вучылішчы не існуе. Замест класа — узвод, замест паралелі — рота.

За кожнай ротай замацаваны камандзір, яго памочнік па маральна-псіхалагічнай падрыхтоўцы, старшы афіцэр-выхавацель, афіцэр-выхавацель (у кожнага ўзвода свой), памочнікі афіцэраў-выхавацеляў. Фотаздымкі камандзага складу роты, як і ў цэлым вучылішча, з указаннем імён і прозвішчаў, а таксама пасад размешчаны на стэндзе — так выхаванцам прасцей запомніць людзей, якія за іх адказваюць.

У кожнага з іх — свае задачы. Камандзір роты адказвае за ўсе бакі жыццядзейнасці суворaўцаў: харчаванне, забеспячэнне рэчавай маёмасцю, арганізацыю навучальнага працэсу, наведванне культурна-масавых мерапрыемстваў і іншае. На плячах старшага афіцэра-выхавацеля — планаванне навучальнага працэсу і выхаваўчай дзейнасці, вядзенне дакументацыі. Афіцэр-выхавацель працуе канкрэтна са сваімі дзецьмі. Ён поўнасцю адказвае за іх стан здароўя, знешні выгляд, падрыхтоўку да заняткаў, арганізацыю асабістай пастоы. Пакажа, як правільна заслаць ложак, падшыць каўнерыкі, дапаможа папрасаваць кіцель. Аднак гэта толькі на першапачатковым этапе навучання. Затым выхаванцы ўсё павінны рабіць самі.

Аднак гэта не азначае, што яны сам-насам застаюцца са сваімі праблемамі. Афіцэр-выхавацель або яго памочнік заўсёды знаходзяцца побач, таму ў любы момант можна разлічваць на іх дапамогу. Што датычыцца настаўнікаў, якія не з'яўляюцца ваеннаслужачымі, то яны адказваюць выключна за навучальны працэс. Псіхолаг назірае за маральна-псіхалагічнай гатоўнасцю суворaўцаў да знаходжання і навучання ў вучылішчы, кантралюе ўзаемаадносіны выхаванцаў з калектывам, іх настрой.

«Калі дзеці толькі прыйшлі ў вучылішча, яны яшчэ не зусім разумеюць, хто ёсць хто і куды яны трапілі, — тлумачыць Вольга Драздова. — Першыя два месяцы — максімальнае назіранне за кожным суворaўцам. На гэта накіравана работа ўсяго афіцэрскага складу. Афіцэры-выхавацелі знаходзяцца з хлопцамі ад пад'ёму да адбою. Калі бачаць, што ў кагосьці з іх ёсць пэўная праблема, звяртаюцца па дапамогу да псіхолага. Як толькі суворaўцы пачынаюць разумець, з кім могуць падзяліцца сваёй бядой, прыходзяць да мяне самі».

Псіхолаг роты знаходзіцца на пастаянным сувязі з бацькамі. Калі ёсць пэўнае пытанне, якое патрабуе ўдакладнення, яна ім тэлефануе. І, наадварот, мамы і таты, заклапочаныя паводзінамі і настроем сваіх дзяцей, нярэдка звязваюцца з псіхолагам роты: удакладняюць інфармацыю, просяць парады ў канкрэтнай сітуацыі. «Чым хутчэйшы званок — тым больш эфектыўным з'яўляецца вырашэнне праблемы», — лічыць Вольга Драздова.

### «Не шкадую, што паступіў»

Распарадак дня ў суворaўцаў строгі і дакладны. Усё ўзаемазвязана, таму адхіляцца ад плана непажадана. Дзень у выхаванцаў вучылішча пачынаецца ў сем гадзін раніцы (толькі ў выхадныя дазваляецца паспаць на гадзіну больш). Пасля — зарадка, снядана. Заняткі з перапынкам на абед доўжацца з 8.40 да 15.50. Пасля ўрокаў прадугледжаны падвячорак. Затым — выхаваўчая работа, самастойная падрыхтоўка, падчас якой суворaўцы вучаць урокі на будучы дзень. Вячэраюць у вучылішчы ў восем гадзін вечара. У абавязковым парадку — прагляд інфармацыйнай перадачы па тэлебачанні: маладыя людзі павінны быць у курсе падзей, якія адбываюцца ў краіне і свеце. Перад сном — вячэрняя прагулка і гігіенічныя працэдуры. Дзень у суворaўцаў заканчваецца ў 22.00 — 22.15.

Як прызнаецца Мікіта Цэбрук, да распарадку ён хутка прызвычаіўся. Будучы дома, хлопец таксама рана ўставаў, ніколі да апоўначы не сядзеў. Мікіта родам з Пружанскага раёна. Жыхары аграгарадка Кабылаўка ганарацца сваім аднавяскоўцам, які вучыцца ў суворaўскім вучылішчы. Напэўна, хтосьці зайздросціць, калі Мікіта прыязджае дадому ў парадней форме. «Настаўнікі сказалі, што парадная форма мне пасуе», — дзеліцца ўражаннямі пасля першай паездкі на малую радзіму ён.

Мікіта са шматдзетнай сям'і. Так склалася, што яго разам з малодшым братам выхоўвае бацька. Менавіта ён параіў сыну паступаць у Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча. Вельмі ганарыцца, што ўсё атрымалася.

«Вельмі сумую па бацьку, брату, рэгулярна ім тэлефаную, — расказвае суворавец. — Дома бываю нячаста — далёка. Калі застаюся ў Мінску, праводжу час з хросным бацькам. Мне вельмі падабаецца сталіца!»

Хлопец адзначае, што кормяць у вучылішчы добра. «Я нават бы сказаў, што шмат, — удакладняе Мікіта. — Добра, што ў размяшчэнні ёсць турнік, мы на ім як малпачкі. Займаемся і ў спартыўнай



зале. З задавальненнем наведваю бібліятэку. У нас самы добры афіцэр-выхавацель. Дзмітрый Іванавіч і пажартуе з намі, і дапаможа, калі трэба. Мы як адна сям'я. Не шкадую, што паступіў. Мне тут падабаецца».

### Заўтрашнія афіцэры

На фінішнай дыстанцыі знаходзяцца выхаванцы вучылішча Раман Камкоў і Уладзімір Ігнатковіч. Маладыя людзі вучацца ў выпускной, чацвёртай, роце. Яны кажуць, што час, праведзены ў суворaўскім, пралятае вельмі хутка, таму рэкамендуюць сваім малодшым таварышам атрымліваць асалоду ад кожнага дня, праведзенага ў гэтых гістарычных сценах.

Раман родам з Бабруйска. Ён згадвае, што рашэнне вучыцца менавіта тут было свядомым з самага пачатку. Пра суворaўскае хлопцу расказаў настаўнік працы, палкоўнік у адстаўцы. Узнікла жаданне паглядзець на ўсё знутры. Пасля наведвання вучылішча ў дзень адкрытых дзвярэй Раман прыняў рашэнне, што будзе сюды паступаць.

Уладзімір упершыню задумаўся пра суворaўскае пасля таго, як разам з бацькам наведалі ваенны парад у Мінску, прымеркаваны да Дня Незалежнасці. Захапленне прыгожымі хлопцамі ў форме з пунсовымі пагонамі і генеральскімі лампасамі, сінхронным біццём у барабаны — і лёс юнага жыхара сталіцы быў прадвызначаны. Калі прыйшоў час, ён паспяхова здаў уступныя іспыты і быў залічаны ў вучылішча.

Уладзімір прызнаецца, што да новай абстаноўкі прызвычайваўся на працягу года. «Тэлефанаваў маме, плакаў, хацелася пагуляць з сябрамі, але стойка пераносіў усе цяжкасці, — успамінае ён той перыяд. — Праз год стала лягчэй, прыйшло ўсведамленне, дзе знаходжуся і для чаго мне гэта патрэбна».

Раман згадвае, што складанасці ў адаптацыйны перыяд дадала каранавірусная інфекцыя. «І калі да гэтага мы хоць раз на месяц ездзілі дадому, то з увядзеннем ковідных абмежаванняў сувязь з роднымі трымалі выключна па тэлефоне, — кажа ён. — Афіцэры-выхавацелі арганізоўвалі цікавую культурную праграму, але нам, першакурснікам, не хапала роднага дома».

Праз пэўны перыяд родным домам стала і вучылішча. Суворaўцы прызнаюцца, што тут сустрэлі сапраўдных сяброў. Хутка яны паступяць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, але гэта не перашкода падтрымліваць сяброўскія сувязі.

Рамана па душы дакладныя навукі, таму пасля заканчэння вучылішча малады чалавек плануе паступаць на ваенны факультэт БНТУ — марыць быць эканамістам. Уладзіміру лягчэй даюцца хімія і біялогія: ён хоча стаць курсантам Ваенна-медыцынскай акадэміі імя Кірава, якая знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу.

Маладыя людзі ніколі не шкадавалі аб тым, што паступілі ў суворaўскае. І не толькі таму, што вырашылі звязаць сваё жыццё са службай. «Выходзячы адсюль, адчуваеш сябе сапраўдным мужчынам, — кажа Раман. — Параўноўваючы сябе з нашымі равеснікамі, якія вучацца ў школах (нікога не хачу пакрыўдзіць), магу сказаць, што мы больш самастойныя і дысцыплінаваныя».

«За гады навучання ў вучылішчы мы атрымалі і сур'ёзнае духоўнае выхаванне, — дадае Уладзімір. — Пабывалі ва ўсіх тэатрах Мінска і не толькі. За чатыры гады ні разу не схадзілі па пэўнаю пастаноўку два разы. Заўсёды было нешта новае і цікавае. З трэцяга курса пачалі ўдзельнічаць у балях. Спадзяюся, што гэты вопыт нам спатрэбіцца».

Хочацца верыць, што ўсе мары гэтых маладых людзей і іншых суворaўцаў абавязкова спраўдзяцца. Калі ў кагосьці з іх і не атрымаецца стаць афіцэрам, у любым выпадку адукацыя і выхаванне, якое яны набылі ў гэтых сценах, ім абавязкова спатрэбяцца. Што ні кажы, а суворaўская загартоўка заўсёды на карысць сапраўдным мужчынам і патрыётам.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## Отчет эмитента ценных бумаг за 3 квартал 2023 года

# ООО «Темпл Сити»

220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260
Вид экономической деятельности: сдача внаем собственного и арендуемого имущества. Единица измерения: тыс. руб.

### Бухгалтерский баланс на 30 сентября 2023 года

| АКТИВЫ | Код стро-ки | На 30 сентября 2023 года | На 31 декабря 2022 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 9 855 | 9 993 |
| Нематериальные активы | 120 | - | 1 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 14 | 14 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 9 | 9 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **9 878** | **10 017** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 14 | 14 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 14 | 14 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 803 | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 134 | 142 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 24 | 19 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 229 | 80 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 204** | **255** |
| **БАЛАНС** | **300** | **11 082** | **10 272** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код стро-ки | На 30 сентября 2023 года | На 31 декабря 2022 года |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 874 | 1 874 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 2 903 | 2 903 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (42) | (42) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | (125) | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **4 610** | **4 735** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 4 188 | 3 906 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 334 | 334 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **4 522** | **4 240** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 185 | 629 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 684 | 575 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 81 | 93 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 20 | 36 |
| по авансам полученным | 632 | 6 | 8 |
| по налогам и сборам | 633 | 16 | 13 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | - | - |
| по оплате труда | 635 | 2 | 1 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 37 | 35 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 950** | **1 297** |
| **БАЛАНС** | **700** | **11 082** | **10 272** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – сентябрь 2023 года

| Наименование показателей | Код стро-ки | За январь–сентябрь 2023 года | За январь–сентябрь 2022 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 639 | 727 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | - |
| Валовая прибыль | 030 | 639 | 727 |
| Управленческие расходы | 040 | (401) | (352) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 238 | 375 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 414 | 3573 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (418) | (371) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 234 | 361 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | 1 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | - | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 255 | 1756 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 255 | 1756 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (613) | (1 140) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (222) | (231) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (389) | (906) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (2) | (3) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (358) | 617 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (124) | 978 |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (124) | 978 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (124) | 978 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Земельный участок и местонахождение лота | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение с инв. № 631/С-67692 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание мобильное, 33,2 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к – здание мобильное, а – навес) | Кадастровый номер 621350100007002500, площадью 0,0229 га, назначение – для строительства и обслуживания здания мобильного. Право аренды. Ограничения (обременения) прав на зем. участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 Вольт, площадь 0,0001 га. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А | 721 461,60 | 72 146,16 | 36 073,08 |
| | Кап. строение с инв. № 631/С-67691 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ЖКУ, 737 кв. м, составные части и принадлежности: А1/кп-технологическое здание, А – СКЛАД ЖКУ) | Кадастровый номер 621350100007002501, площадью 0,1282 га, назначение – для строительства и обслуживания склада ЖКУ. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109А | | | |
| | Кап. строение с инв. № 631/С-67689 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 1989,8 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к – склад удобрений 1 химия, а – навес) | Кадастровый номер 621350100007002498, площадью 0,3076 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109 | | | |
| | Кап. строение с инв. № 631/С-67695 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ФОСМУКИ С ПРИЕМНЫМ УСТРОЙСТВОМ И КОМПРЕССОРНОЙ, 162 кв. м, составные части и принадлежности: 1/кп – компрессорная, 1А1/к – приемное устройство, а1 – навес, а2 – навес, А-СКЛАД ФОСМУКИ С ПРИЕМНЫМ УСТРОЙСТВОМ И КОМПРЕССОРНОЙ) | Кадастровый номер 621350100007002503, площадью 0,2309 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки с приемным устройством и компрессорной по ул. Шубина в г. Вилейке. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б | | | |
| | Кап. строение с инв. № 631/С-67694 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – СКЛАД ФОСМУКИ 1 ХИМИЯ, 0 кв. м, составные части и принадлежности: А-СКЛАД ФОСМУКИ 1 ХИМИЯ) | Кадастровый номер 621350100007002502, площадью 0,0316 га, назначение – для строительства и обслуживания склада фосмуки 1 химия по ул. Шубина в г. Вилейка. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109В | | | |
| | Кап. строение с инв. № 631/С-67693 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад удобрений 1 химия, 2083 кв. м, составные части и принадлежности: А1/к – склад удобрений 1 химия, Б1/к-пристройка) | Кадастровый номер 621350100007002499, площадью 0,3064 га, назначение – для строительства и обслуживания склада удобрений 1 химия. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 107 | | | |
| | АВТОВЕСЫ 40 ТН, инв. № 1145 | Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 103А | | | |
| | КОНВЕЙЕР КТ 18, инв. № 1484 | Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109 | | | |
| | Ресивер, инв. № 6048-ОС; компрессор, инв. № 6049-ОС; шкафы электрощитовые, инв. № 6047-ОС, 5 шт. | Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Шубина, 109Б | | | |

| | |
|---|---|
| В отношении лота проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 180 (30060) за 16.09.2023, стр. 6 | |
| **Дата и время проведения торгов** | **14 ноября 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 31 октября 2023 года до 16.00 10 ноября 2023 года |
| **Ограничения (обременения)** | Лот № 1 имеет обременение в виде заключенных договоров аренды. Вопросы по обременениям по тел. +375293489225 |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту 1, ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 14.11.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: **+375299999112, Чеслав.** Дополнительная информация по предмету торгов по тел. **+375293082762, Екатерина.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416 г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# «Нават у эпоху глабальнай лічбавізацыі ўніверсітэцкая адукацыя немагчыма без кнігі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Як вам, Юрый Пятровіч, падалося ў Брэсце? Ці заўважылі адрозненні Заходняй Беларусі ад паўночнага рэгіёна?***

— Наша краіна шматаблічная, разнастайная, пэўныя адрозненні паміж рэгіёнамі ёсць. І гэта цудоўна. Тая самая разнастайнасць і забяспечвае больш шырокія магчымасці прадстаўляць краіну на знешнім контуры. Дасягненні рэгіёнаў таксама адрозніваюцца. Я ўжо меў магчымасць азнаёміцца з поспехамі аграрнага сектара Брэсцкай вобласці, які вызначаецца культурай вытворчасці, якасцю прадуктаў харчавання, канкурэнтаздольных на многіх рынках свету. Маюцца свае асаблівасці ў Віцебшчыны, Гродзеншчыны, многімі з якіх ёсць нагода ганарыцца... Брэст — прыгожы, стыльны, прывабны горад, думаю, тут будзе камфортна жыць і працаваць.

***— А студэнты адрозніваюцца ў Брэсце і Полацку?***

— Студэнт — ён паўсюль студэнт. Сёння гэта свабодны, сучасны малады чалавек, які мае пэўныя амбіцыі, што цалкам нармальна. У рабоце са студэнтамі я адчуў адрозненні хіба толькі абумоўленыя ўзростам. Там я працаваў з першым-другім курсамі, а ў Брэсце ў мяне выпускны курс. Гэта адчуваецца, хлопцы і дзяўчаты ўжо сфарміраваліся як асобы, многія, нават, лепш сказаць большасць, працуюць. А так студэнт — чалавек вясёлы, дасціпны, цікаўны. Такім і павінен быць.

***— Вы сказалі, што выкладаеце на старэйшых курсах фізіку. Рыхтуючыся да нашай размовы, нават тэму вашай дысертацыі пазначыла: «Плазменныя крыніцы электронаў з пучкамі вялікага сячэння для электронна-прамянёвых тэхналогій». Для недасведчанага гэта вельмі складаныя матэрыі. Ці ёсць тут, у Брэсце, магчымасці для рэалізацыі навуковых інтарэсаў, працягу вашых распрацовак?***

— Універсітэт так уладкаваны, што вынікі даследавання вучоных складаюць пэўную частку выкладчыцкага працэсу. У ходзе выкладання агульнай фізікі я буду разглядаць гэтыя пытанні, вядома, неглыбока, павярхоўна, у рамках вучэбнай праграмы. Ну, а тая навуковая група, у складзе якой я працую, арыентавана на вырашэнне прыкладных праблем прамысловасці, скажам, на стварэнне плазменных крыніц для зваркі цяжканагружаных вузлоў у машынабудаванні. Гэтыя тэхналогіі знаходзяць прымяненне на нашых прадпрыемствах — МТЗ, МАЗ, БелАЗ.

Што датычыцца працягу даследаванняў па маёй тэме тут, у Брэсце, гэта не ўяўляецца магчымым, таму што патрэбна даволі дарагое абсталяванне. Аснашчэнне лабараторыі пад мяне аднаго немэтазгодна з дзяржаўнага пункту гледжання. Калі з'явяцца паслядоўнікі, дастойныя напрацоўкі, у перспектыве можна будзе разглядаць. Чаму б і не? Усё ж мяняецца, развіваецца, асабліва ў сферы навукі, тым больш што фізіка-матэматычны факультэт у Брэсцкім універсітэце традыцыйна моцны, тут працуюць добрыя спецыялісты, ёсць свае навуковыя школы.



***— Ці ацанілі вы ўжо маштабы ўстановы, якой хутка 80 гадоў? Усё ж дзевяць факультэтаў, магістратура, аспірантура, шэраг навуковых школ, асветніцкія цэнтры і шмат чаго іншага, што павінна функцыянаваць, развівацца.***

— Сапраўды, універсітэт уяўляе сабой аграмадны жывы арганізм, гэткую махіну, калі казаць пра структуру спецыяльнасцяў, пра аб'ём падрыхтоўкі, пра колькасці структурных падраздзяленняў. Гэта вялікая ВНУ, якая выконвае вельмі важную функцыю падрыхтоўкі найперш педагагічных кадраў для заходняга Палесся і рэгіёна ў цэлым, спецыялістаў вельмі запатрабаваных. На жаль, так складваецца сітуацыя, што мы не задавальняем усе заяўкі на выпускнікоў. За той кароткі час, што працую, не спасціг дасканала ўсе працэсы, можна сказаць, рухаюся ў гэтым кірунку. Дапамагае тое, што ўсё прафесійнае жыццё я працаваў у гэтай сістэме, разумею, як устроены ўніверсітэт, як ідуць працэсы, як павінны ісці.

***— Што новага адкрываеце для сябе ў Брэсцкім універсітэце?***

— Яшчэ раз упэўніваюся, што кожны з нашых універсітэтаў індывідуальны, адметнасць ВНУ складаецца з навуковых калектываў, спецыфікі падрыхтоўкі. Пакуль працэс знаёмства працягваецца, актыўна камунікую з выкладчыкамі факультэтаў. Сустрэўся з усімі першакурснікамі. Літаральна днямі сустрэўся з маладымі спецыялістамі, якія прыйшлі ва ўстанову ў 2022—2023 гадах, апошніх, дарэчы, каля паўсотні. Універсітэт патрабуе развіцця, прытоку новых кадраў. У нас ёсць перавага, мы можам падрыхтаваць спецыяліста для сябе. Ужо відавочна, што калектыў універсітэта моцны. Ёсць свае навуковыя школы, вучоныя-педагогі, якія могуць павесці за сабой і робяць гэта. Яны прызнаныя і ў нашай краіне, і за яе межамі.

Аб гэтым сведчыць і мая першая замежная паездка ў якасці рэктара. У канцы верасня пабываў на вялікім форуме ў Маскве, які праходзіў на базе Вышэйшай школы эканомікі. Калі выступіў з прэзентацыяй нашага ўніверсітэта, было вельмі шмат водгукаў па тых кірунках, якія распрацоўваюцца ў нас. Да мяне падыходзілі калегі з Масквы, іншых гарадоў Расіі, іншых краін з навуковымі і практычнымі прапановамі. Спадзяюся, што завяжуцца творчыя кантакты. Таму што вышэйшая школа па сваёй прыродзе інтэрнацыянальная. Такія ўзаемасувязі надзвычай важныя і для вучоных, каб разумець свой узровень, і для ўніверсітэта ў цэлым. Удзел у сумесных навуковых праектах дае практычныя вынікі. Яны, у сваю чаргу, апублікаваны ў высакарэйтынгавых часопісах, спрыяюць і рэйтынгу ўніверсітэта, працуюць на прыцягненне замежных грамадзян на навучанне ў нашу краіну. Такім чынам наладжваюцца ўсебаковыя дзелавыя сувязі, нават, бывае, сем'і ўтвараюцца. Усё пералічанае прыводзіць да стварэння новых прадпрыемстваў, выстройвання лагістычных ланцужкоў, праз якія пойдуць тавары ў адзін і другі бок. Мы бачылі падобнае на прыкладзе Савецкага Саюза. А ў выніку фінансавыя выгоды маюць і краіна ў цэлым, і ўніверсітэт.

***— На якіх кірунках цяпер лічыце неабходным засяродзіць намаганні?***

— Кірункаў шмат. Калі казаць пра адзін з глабальных, магістральных, лічу сваёй задачай арыентаваць калектыў, каб ён сам выпрацоўваў стратэгію развіцця на даволі доўгатэрміновую перспектыву. Нягледзячы на вялікія маштабы, мы адзіны калектыў, свайго роду карпарацыя, кожны член якой павінен разумець сваё месца і ролю, усведамляць, што ад яго многае залежыць.

Важны кірунак — падрыхтоўка навуковых кадраў. Гэтаму буду ўдзяляць асаблівую ўвагу. Не скажу, што з ім сітуацыя зусім дрэнная, але ж па некаторых факультэтах патрабуецца амаладжэнне. Гэта аб'ектыўны працэс, заўсёды неабходна працаваць з маладымі, каб яны актыўна ішлі ў навуку. Найперш трэба ствараць умовы, будзем з калегамі працаваць над гэтым: дзесьці, можа, дастаткова падкарэкціраваць, падналадзіць, а недзе і ўключаць новыя механізмы.

Як вядома, галоўная задача ўніверсітэта — падрыхтоўка кадраў. Тут мы працуем у цеснай звязцы з абласнымі ўладамі, з Галоўным упраўленнем па адукацыі абласнога выканкама. На ўніверсітэт ускладаецца шмат іншых задач. Скажам, работа з адоранымі вучнямі. У нас добрая спартыўная база, яна павінна працаваць на рэгіён. Гэта толькі прыклады, якія першыя прыйшлі на думку, насамрэч падобных задач многа.

Патрабуе абнаўлення матэрыяльная база: пачынаючы са знешняга выгляду і заканчваючы аснашчэннем вучэбным, лабараторным абсталяваннем — тым, якое будзе адпавядаць сучаснаму ўніверсітэту. Гэтыя пытанні мне задаюць калегі, калі сустракаюся на факультэтах, вось і днямі іх узнімалі маладыя спецыялісты. Тут на першы план выступае фінансавы складнік. З вырашэннем пытання фінансавання работа па абнаўленні пачнецца.

***— Інфарматызацыя і лічбавізацыя цяпер таксама ў шэрагу прыярытэтных кірункаў...***

— Ніхто не вядзе гаворку аб тым, што трэба замяніць выкладчыка штучным інтэлектам, хоць такія прапановы дзе-нідзе ў свеце ўжо гучаць. Не думаю, што чалавека ў гэтым плане стане магчымым замяніць нават у далёкай перспектыве. І ўсё ж інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, у тым ліку дыстанцыйная адукацыя, павінны прысутнічаць. Напрыклад, адукацыя дарослых. Цяпер рэалізоўваецца прынцып: адукацыя праз усё жыццё. Сёння, як вядома, навучыцца адзін раз на ўсё жыццё немагчыма — павышаць кваліфікацыю трэба пастаянна. Агульнавядома, што любы спецыяліст, калі хоча расці альбо хоць бы адпавядаць, павінен вучыцца. У нас ёсць інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. І вось тут большую частку адукацыйных праграм можна рэалізаваць у дыстанцыйнай форме. Пэўная іх частка прадугледжана і для студэнтаў, калі да традыцыйных формаў навучання дадаюцца дыстанцыйныя. Гэты працэс ідзе і ў цэлым па краіне, і ў нашым універсітэце ў прыватнасці.

Яшчэ адзін важны кірунак работы — пазіцыянаванне ўніверсітэта ўнутры краіны і за яе межамі. І тут на першы план выступаюць сучасныя медыя. Мы робім упор на развіццё ўніверсітэцкіх камунікацый, гэта каналы навін у сацсетках, вядома, наш сайт. З дапамогай пералічанага можна выстройваць дыялог з партнёрамі — заказчыкамі кадраў, з абітурыентамі і іх бацькамі, а таксама ўнутраную камунікацыю. Я зацікаўлены ў тым, каб была зваротная сувязь, якая заклікана працаваць на стварэнне карпаратыўнага асяродка ў найлепшым сэнсе, таго, што фарміруе прыналежнасць кожнага члена калектыву да ўніверсітэта. І ў дапамогу нам — сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Дарэчы, на сустрэчы з маладымі спецыялістамі мне задалі пытанне: "Цяперашняя лічбавая гісторыя — гэта добра ці дрэнна?" Я сказаў, што і скальпель у руках злыдня можа стаць прыладай забойства. Дрэнна заганяць сябе ў залежнасць ад «Гугла», ад інтэрнэту ў цэлым. Сёння, на жаль, забяры гэта ў некаторых, і яны адразу зробяцца бездапаможнымі. Каб такое не здарылася, чалавеку патрэбна развівацца. А развіццё немагчыма без падмурка класічнай літаратуры, асноў навук, якія ўтрымліваюць кнігі. Без кнігі не бачу адукаванага чалавека, універсітэцкай адукацыі наогул.

***— Кожны новы кіраўнік імкнецца стварыць сваю каманду. Кадравыя рашэнні вы яшчэ не прымалі?***

— Гэта сапраўды так. І пэўныя кадравыя рашэнні непазбежныя. Але я не маю намеру рабіць гэта хутка, з наскоку. Пакуль прыглядаюся, знаёмлюся з людзьмі. Потым, спадзяюся, час, само развіццё падзей падкажуць правільныя рашэнні.

***— Калі можна, крышачку раскажыце пра сябе. Вы з сям'і выкладчыкаў-вучоных ці не, што паўплывала на выбар прафесіі і рашэнне працаваць у адукацыі?***

— Я не прадаўжальнік дынастыі, нарадзіўся ў Наваполацку, паходжу з інжынерна-рабочай сям'і. Некалі ў малады горад з суседніх населеных пунктаў прыехалі хлопец і дзяўчына, мае будучыя бацькі, сустрэліся, стварылі сям'ю. Цікавасць да дакладных навук ад бацькі, які заўсёды быў з тэхнікай на «ты». Старэйшы брат таксама цікавіўся электронікай, радыётэхнікай, у школьныя гады я займаўся на станцыі юных тэхнікаў. Таму і пайшоў вучыцца на радыётэхнічны факультэт Полацкага ўніверсітэта. Вучыўся з задавальненнем, думаў, што буду працаваць на адным з прадпрыемстваў па спецыяльнасці. Але нечакана для мяне на апошнім курсе прапанавалі застацца ва ўніверсітэце. На канчатковае рашэнне паўплывала знаёмства з доктарам навук Уладзімірам Аляксеевічам Груздзевым, які ў свой час прыехаў да нас з Расіі, стварыў навуковую групу. Шматгранны, таленавіты чалавек, тыповы сібірак, прыехаў ужо сфарміраваным вучоным. Выбраў не Мінск, нават не абласны цэнтр, а Наваполацк, і гэта стала вялікай удачай для ўніверсітэта і ўсіх нас, хто працаваў на тым падмурку, які стварыў прафесар. Тэматыка і кірунак даследаванняў, пра які мы гаварылі спачатку, абумоўлены навуковай школай Груздзева.

Далей так склалася, што будаваў кар'еру па адміністрацыйнай лініі, прайшоў усе прыступкі ад асістэнта кафедры, выкладчыка да прарэктара ВНУ. Вядома, калі б пайшоў па размеркаванні на прадпрыемства, жыццё склалася б інакш, але аб тым, што выбраў навуку і выкладанне, ні разу ў далейшым не пашкадаваў.

***— Жадаю вам і па выніках работы ў Брэсце ніколі не пашкадаваць аб тым, што сюды закінуў лёс!***

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Полюс інтарэсаў

# Навічкі і «ветэраны»

**У НАН Беларусі дадзены старт 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі.**

**У новым сезоне ў Антарктыду адправяцца 13 чалавек пад кіраўніцтвам вопытнага палярніка, удзельніка ўсіх пятнаццаці папярэдніх экспедыцый Аляксея Гайдашова. У саставе экспедыцыі — навуковыя супрацоўнікі НАН Беларусі (Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў, НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, Інстытута прыродакарыстання, Інстытута фізікі), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы і іншых арганізацый краіны. Сем спецыялістаў ужо маюць досвед працы ў Антарктыдзе і шэсць чалавек — пачаткоўцы. Важны момант — навуковыя супрацоўнікі складаюць палову саставу экспедыцыі.**

Як адзначыў, звяртаючыся да палярнікаў, Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў, у навуковым плане экспедыцыя выконвае шырокі спектр даследаванняў. «У сезон 2023—2024 гадоў 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі трэба будзе амаль шэсць месяцаў знаходзіцца на Лядовым кантыненце, прадоўжыць абсталяванне і ўладкаванне Беларускай антарктычнай станцыі ў раёне гары «Вячэрняя», правесці дзясяткі навуковых даследаванняў і эксперыментаў, выканаць тысячы навуковых вымярэнняў прыродных параметраў у рамках падпраграмы «Развіццё дзейнасці Беларускай антарктычнай станцыі» Дзяржаўнай праграмы «Навукова-інавацыйная дзейнасць Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на 2021—2025 гады», — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў. — Падчас работы ў 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі вам трэба будзе развіць і дапоўніць атрыманыя раней вынікі і выканаць работы па новых напрамках у рамках навукова-тэхнічных заданняў па мерапрыемствах праграмы. Сярод новых кірункаў навуковай дзейнасці — работы па ўводзе ў эксплуатацыю сейсмічнай станцыі ў раёне размяшчэння Беларускай антарктычнай станцыі і работы па забеспячэнні палявым матэрыялам (імхі, лішайнікі і інш.) для вывучэння фітахімічнага і фармакалагічнага патэнцыялу прадстаўнікоў флоры Антарктыкі з прымяненнем оміксі-тэхналогій і інш.»

Начальнік 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей Гайдашоў падкрэсліў, што кожны год экспедыцыя папаўняецца новымі прыборамі, апаратамі і комплексамі. «Мы забяспечаны ўсім на самым высокім узроўні для правядзення выніковай навуковай работы», — адзначыў ён.

Авангардная каманда 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі накіруецца на лядовы кантынент у пачатку лістапада. Вяртанне ў Мінск 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі плануецца ў трэцяй дэкадзе мая 2024 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

І мы там былі

# НАСЕКЛІ І ЗАПАЛІЛІ

## 33 кубы драўніны нарыхтавалі журналісты падчас чэмпіянату па колцы дроў

**Спаборніцтвы на адкрытым паветры прайшлі на возеры Вяча. Рэспубліканскае мерапрыемства для СМІ, на якое з'ехаліся 35 каманд з больш як 240 удзельнікамі, зладзілі сёлета другі год запар. Мяркуецца, што чэмпіянат можа выйсці на міжнародны ўзровень, тым больш што ўжо сёлета да яго далучылася кітайскае інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа».**

*— Актывісты з усіх раёнаў Беларусі прыехалі, каб надаць ініцыятыве мінулага года новы размах, —* заўважыў **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** *— На чэмпіянаце ўнікальнае спалучаецца з карысным. Гэта і спорт, і магчымасць пры такім цудоўным надвор'і пабыць на свежым паветры, чаго нам вельмі не хапае.*



Дзякуючы ўдзелу каманды агенцтва «Сіньхуа» спаборніцтвы атрымаліся міжнароднымі.

Акрамя мінулагодніх дысцыплін «колка дроў» мужчынамі і жанчынамі і «перасяканне бервяна сякерай», з'явіліся і новыя. Мужчыны калолі дровы «па-прэзідэнцку», у камандный эстафеце пабольшала этапаў.

Мужчынам трэба было рассячы пяць звычайных калод і пяць — з сукамі. Прычым дровы павінны былі атрымацца не шырэйшымі за дзесяць сантыметраў — за парушэнне дадаваўся штрафны час. Жанчынам трэба было рассячы пяць звычайных калод і дзве з сукамі — памер дазваляўся да 20 сантыметраў.

Перасячы бервяно — задача яшчэ тая, а ўжо рассячы дзве калоды «па-прэзідэнцку» — з выкарыстаннем кувалды, дык і пагатоў. Тыя калоды ледзьве ўдвух мужчыны ўздымалі, каб паставіць для расколвання.



«Звяздоўская» каманда «Прэс-сякера» секла хутка і дакладна.

Камандная эстафета праходзіла ў некалькі этапаў. Спачатку адзін забівае цвік у бервяно, другі яго выцягвае. Потым трэба напілаваць шэсць калодак з бервяна пілой «Дружба» — так, звычайнай двуручнай, якую цягаць удваіх трэба і прымервацца да хуткасці партнёра. Пасля напілаваныя калодкі наступны ўдзельнік коле, і ўжо потым усе разам складаюць вогнішча пад шнурам і падпальваюць яго, каб шнур перапаліўся.

Калі да пачатку спаборніцтваў было даволі холадна і нават спрабаваў ісці дробны снег, то адразу ж пасля старту стала горача. Падбадзёрвалі ўдзельнікаў і каманды, і госці, якія прыйшлі падтрымаць.

Для гасцей, дарэчы, таксама стварылі шмат лакацый. Ім прапанавалі, напрыклад, сабраць драўляныя фігуры з падрыхтаваных кавалкаў. Арганізатары пасля прызналіся, што ў скрынках былі і запасныя дэталі, аднак абсалютна ўсе ўдзельнікі прымайстравалі да фігурак жывёл, якія яны сабралі, усе элементы — і запасныя таксама. Балельшчыкі гулялі ў «гарадкі» паленамі і цягалі сані, нагружаныя дровамі, па траве.

Вынік падводзілі ў камандным і асабістых заліках. Першае месца сёлета заваявалі журналісты ваеннага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр», а суцяшальны і жартаўлівы прыз — пасашок на дарогу (так, вы правільна здагадаліся, што гэта) — дастаўся тэлерадыёканалу «Гродна плюс», які ў агульным заліку апынуўся на апошняй пазіцыі. «Звяздоўская» каманда «Прэс-сякера» ўвайшла ў першую палову ўдзельнікаў. Было весела, спаборнічалі па-сур'ёзнаму і выкладваліся напоўніцу.

*— Думаю, і трэцяму, і чацвёртаму чэмпіянату быць, —* лічыць **Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінаблвыканкама.** *— Чэмпіянат па колцы дроў сярод работнікаў СМІ перарос у традыцыю.*

Пэўна ж, так, бо ўжо напрыканцы спаборніцтваў журналісты складалі планы, як лепш праявіць сябе ў наступным годзе.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

**Спаборніцтвы па колцы дроў сярод журналістаў пачалі праводзіць летась. У інтэрнэце з'явілася відэа, на якім кіраўнік дзяржавы сек дровы, каб не даць змерзнуць еўрапейцам. Відэа стала сапраўды папулярным, і журналісты прапанавалі Аляксандру Лукашэнку арганізаваць чэмпіянат, каб праверыць, хто з журналістаў хутчэй, больш спрытна і тэхнічна валодае сякерай і пілой. Прэзідэнт ухваліў ідэю, і 7 лістапада прайшоў першы чэмпіянат па колцы дроў сярод работнікаў СМІ.**

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ перадала ад кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі прывітанне ўдзельнікам чэмпіянату сярод СМІ. «Выдатны настрой, выдатныя. Вельмі рада праз год сустрэцца тут з усімі вамі ў значна больш шырокім складзе. Гэта важна, і мы ўсе гэта разумеем, — сказала Наталля Эйсмант. — Думаю, мы не павінны стамляцца дзякаваць за тое, што вакол становіцца ўсё складаней, усё цяжэй, а мы зноў збіраемся і зноў паўдня сячэм, спаборнічаем, весялімся і гэтак далей. Гэта праўда класна!»**

# ДЛЯ ЧЫСТАЙ І ЗЯЛЁНАЙ КРАІНЫ

### У Полацкім парку Мінска з'явілася ліпавая алея

**Адзіны дзень азелянення, ініцыяванавы Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў рамках экалагічнай кампаніі «Мірная стваральная праца на карысць чыстай і зялёнай краіны!», прайшоў сёння ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Удзел у акцыі прынялі звыш пяці тысяч чалавек: супрацоўнікі сістэмы Мінпрыроды, прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, адукацыйных і грамадскіх устаноў сабраліся пасадзіць больш за 60 тысяч саджанцаў ліп, клёнаў, дубоў, рабін, грабаў, соснаў, вербаў, туй і інш. Адным з самых знакавых мерапрыемстваў дня стала закладка ліпавай алеі ў Полацкім парку сталіцы.**

Полацкі парк — адно з любімых і найпрыгажэйшых месцаў адпачынку мінчан. Галоўная яго асаблівасць — шматлікія водныя каскады, за якія ў 1989 годзе праект «Архітэктурна-ландшафтныя комплексы ўсходніх раёнаў г. Мінска» быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. Сёння да паркавай зоны далучылася новая алея: 50 маладых ліп былі пасаджаны пры асабістым удзеле кіраўніка прыродаахоўнага ведамства Андрэя Худыка і супрацоўнікаў цэнтральнага апарату Мінпрыроды, Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска.

Андрэй Худык падкрэсліў важнасць мерапрыемстваў па азеляненні, добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі, бо ад гэтага залежыць камфортнае жыццё грамадзян:

— Сёння пераважная большасць нашых населеных пунктаў маюць 40 % азелянення і больш. Але мы лічым, што нават гэтага недастаткова. У сувязі з гэтым штогод Мінпрыроды праводзіць акцыі па азеляненні. Прыемна, што на наш заклік заўсёды адгукаецца вялікая колькасць людзей па ўсёй краіне. Не памылюся, калі скажу, што азеляненне і прыборка тэрыторый ад смецця — наш агульны ўклад у аблічча Беларусі.

— Дрэва, пасаджанае сёння, ужо праз некалькі гадоў будзе ўпрыгожваць нашу краіну і цешыць вока нашых жыхароў, таму я лічу, што гэта вельмі важнае мерапрыемства. І мы запрашаем усіх нашых грамадзян, жыхароў гарадоў, вёсак паўдзельнічаць у ім. Гэта наш вялікі ўклад у будучыню, — адзначыў Віктар Галанаў, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Апроч пасадкі дрэў, у парку таксама прыбіралі апалую лістоту, з якой потым будзе зроблены кампост. Завяршылася мерапрыемства ўстаноўкай памятнага каменя.

**Александрына ПАРШЫНА.**

Фестывалім

# ПАСЛЯСМАК «ЗАЛАТОГА ШЛЯГЕРА»

## У Магілёве развіталіся з міжнародным музычным святам

**Гурманы кажуць, што сапраўдныя адчуванні ад ежы прыходзяць пасля. Тое ж самае датычыцца міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер». Песні — таксама свайго роду ежа, толькі духоўная. Фестываль падарыў Магілёву шэсць цудоўных вечароў з удзелам любімых выканаўцаў, чые імёны ўжо ўвайшлі ў залаты фонд музычнага мастацтва. Чым яны парадавалі, захапілі, уразілі? Успомнім, як гэта было.**

### Масткі Марыям Мерабавай

Яркая прадстаўніца джазавай плыні Марыям Мерабава перад канцэртам «Джаз і не толькі» паабяцала, што будзе будаваць масткі паміж сабой і гледачом. Яна мела на ўвазе, што музыка, прыхільніцай якой яна стала яшчэ ў юнацтве, валодае неверагодным удзеяннем. І лічыць, што дзяцей абавязкова трэба вадзіць на канцэрты і рабіць ім прышчэпкі «рытмам і гучаннем».

— Шмат хто думае, што джаз — гэта толькі англійская мова, — разважала яна на прэс-канферэнцыі ў Палацы культуры вобласці. — Яны памыляюцца. Гэта пэўная рытміка, пэўны стан. На якой мове гэта выконваецца, няма ніякай розніцы. Але калі пачынаеш спяваць па-руску, некаторыя сумняваюцца: гэта, напэўна, не джаз. Дзівакі. Джаз — гэта асаблівы стан душы, вялікі сусвет з рознымі падджанрамі. Знакаміты амерыканскі джазавы выканаўца Джон Скофілд, з якім мы сустракаліся на канцэрце ў Маскве, сказаў: «У джазе, галоўнае, не забранзавець, а ісці ў нагу з часам. Гэта самы прагрэсіўны кірунак».

Марыям прызналася: выступленне ў Магілёве — гэта яе паклон Людміле Гурчанцы, якая працавала над мосцікам «джаз — руская мова». «Яна, сама таго не ведаючы, была маім настаўнікам і правадніком», — адзначыла спявачка.

Масток да гледача Марыям зрабіла ў дуэце з Алегам Старыкавым — вучнем джазавага піяніста Міхаіла Окуня, таго самага, з якім Людміла Гурчанка калісьці запісала свой знакаміты альбом «Сумная пласцінка». Усе савецкія песні, якія выбрала артыстка, прагучалі ў джазавым выкананні.

### Візітоўка рэгіёна

За гады існавання фестывалю на ім пабывалі артысты з 25 краін. Звычайна ў дні «Залатога шлягера» стаіць прыгожае сонечнае надвор'е, гэтым разам выпаў першы снег, які не сапсаваў настрой. Радасць велікадушна дарылі госці з сонечнай Італіі: Мікеле Пома, Антанела Бучы, Маўра Менгалі. Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Алена Ланская разгарачыла залу шлягерам Валерыя Лявонцьева 80-х гадоў «Палёт на дэльтаплане». А пад гукі іскрамётнага хіта «Сіні іней» у выкананні экс-саліста ВІА «Сіняя птушка» Аляксандра Драздова народ танцаваў у праходах. Музыканты ВІА «Лейся, песня», якія, дарэчы, завіталі на «Залаты шлягер» чацвёрты раз, парадавалі песнямі, якія яшчэ 40 гадоў таму гучалі, напэўна, у кожным доме. Міхаіл Мурамаў павітаўся сваімі знакамітымі «Яблыкамі на снезе». Таццяна Іванова з вечна юным гуртом «Камбінацыя» жадала магілёўчанам фінансавага дабрабыту ў якасці ўступу да песні «Бухгалтар». А «Два кавалачкі каўбаскі» спявачка аб'явіла найлепшым навагоднім хітом, параіла дадаць да яго якую-небудзь салату і прыстойны напой. Ірына Панароўская, як заўсёды стыльная і чароўная, нагадала (у першую чаргу мужчынам), што «Жанчына заўсёды справядлівая» і прызналася, што выходзіць на сцэну (спявачцы сёлета споўнілася 70 гадоў) яе прымушае любоў да гледача. «Лічаць, што я спявачка адной песні і вы ведаеце якой («Рабінавыя каралі». — **Аўт.**), — сказала яна какетліва. — Насамрэч іх шмат. Завіце, і я прыеду». Яна заклікала публіку танцаваць разам з ёй пад хіт пра гітару, якая плача і спявае, дадаўшы: «Няхай наша свята крыху настальгічнае, крыху з мінулага, але гэта наша жыццё».

### Карцінная галерэя фестывалю

«Залаты шлягер» мае свае традыцыі і адметнасці. Адна з іх — жывапісны аўтограф ад артыстаў. Беларускі мастак Анатоль Концуб робіць так званыя нарыхтоўкі будучых карцін, якія павінны завяршыць артысты. Сёлета калекцыя папоўнілася новымі творамі. Беларуская спявачка Жанет, напрыклад, намалявала грыбочкі, арт-група «Беларусы» — вавёрку, італьянцы — птушачак над морам.

— Мора спецыяльна пад італьянцаў рабіў — гэта іх стыхія, — усміхаецца мастак. — Жывапісны экспромт — вельмі цікавая дэталь «Залатога шлягера». Нехта кветачкі намалюе, нехта — чалавечка, нехта — птушак. Нашы госці спрэс знакамітасці. Адна справа — бачыць іх у зале на сцэне, і іншая — восьу такой камернай абстаноўцы з пэндзлем у руках. Гэта вельмі цікавае пераўтварэнне.

У калекцыі ўжо некалькі дзясяткаў карцін з аўтографамі знакамітасцяў. Сярод іх — Рэнат Ібрагімаў, Анатоль Ярмоленка, Крысціна Арбакайтэ, Ігар Нікалаеў, Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, Бары Алібасаў, гурты «На-на», «Boney M» і шматлікія іншыя. Выстаўка «Маляўнічыя грані «Залатога шлягера» працавала ў рамках фестывалю ў холе магілёўскага абласнога Палаца культуры.

«Залаты шлягер — 2023» сказаў: «Да сустрэчы!» Наступны раз ён завітае ў Магілёў праз два гады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДЫСТАНЦЫЙНЫЯ МЕДПАСЛУГІ: ІСНУЮЧЫЯ І БУДУЧЫЯ

## Рэкамендацыя на лячэнне, электронны рэцэпт, даведка з дыспансера...

**Электронны рэцэпт на лекі, які можна атаварыць у рэальнай аптэцы праз пластыкавую «зялёную» картку; заказ талона да ўрача праз інтэрнэт; паслуга дыспансерызацыі шляхам запаўнення анкеты ў асабістым электронным кабінеце з атрыманнем рэкамендацый на рэальнае абследаванне; кансіліумы ўрачоў з дапамогай рэспубліканскай сістэмы тэлемедыцынскага кансультавання. Гэтыя і іншыя лічбавыя магчымасці, датычныя медыцынскай сферы, у Беларусі ўжо рэалізаваныя. У перспектыве да 2025 года — стварэнне адзінай службы кіравання хуткай медыцынскай дапамогі з выкарыстаннем геаінфармацыйных тэхналогій; арганізацыя сэрвісу па кіраванні службай пералівання крыві, у тым ліку з указаннем, ад каго і калі атрымана данацыя; наладжванне тэлемедыцынскага кансультавання па прынцыпе «ўрач — пацыент». Пра існуючыя і будучыя лічбавыя паслугі ў медыцыне нагадалі і расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**



Фота Ірыны СІДАРОК.

### Дыспансерызацыя аднаго дня

Паслуга **3.65.01 «Прадастаўленне звестак для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў (ад грамадзян)»** запрацавала на адзіным партале электронных паслуг з нова года, а паслугу **3.65.02 «Прадастаўленне звестак для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў (ад медыцынскіх работнікаў)»** медыкі ў тэставым рэжыме асвойвалі ўжо напрыканцы 2022-га.

*анкету ад імя чалавека, які прыйшоў на прыём, але ж сам асабіста анкетаванне не праходзіў: не змог ці не захацеў. Для гэтага ўрач праходзіць строгую аўтарызацыю на адзіным партале ў сваім электронным кабінеце юрыдычнай асобы і запаўняе анкетныя даныя для асобы (пацыента) з яго слоў. Гэтыя звесткі трапляюць у сістэму ад імя медработніка, але ж у дачыненні да пацыента, якому ўрач такім чынам дапамагаў праходзіць анкетаванне. У залежнасці ад адказаў чалавека сістэма ставае для яго дакумент з патэнцыяльнымі рызыкамі захворванняў і рэкамен-*



Абедзве паслугі маюць на мэце выяўленне рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў сістэмы кровазвароту, анкалагічных хвароб, хранічных абструктыўных захворванняў лёгкіх і цукровага дыябету і задумваліся для рэалізацыі ідэі дыспансерызацыі аднаго дня: запоўніў анкету — наведаў урача — атрымаў дапамогу, нагадала **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

*— Паслугі ажыццяўляюцца шляхам запаўнення анкеты пры строгай аўтэнтыфікацыі (з дапамогай ID-карткі ці электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП)) у асабістым электронным кабінеце на адзіным партале электронных паслуг. Да пачатку работы паслугі 3.65.01 (для грамадзян) медыкі загадзя асвоілі, як запаўняць дацыямі звароту да пэўных спецыялістаў.*

За няпоўны год атрымана ўжо каля трох мільёнаў гэтых паслуг, і большасць іх здзейснена медыкамі. Толькі каля тысячы анкет запоўнена людзьмі з прымяненнем строгай ідэнтыфікацыі:

*— На жаль, у краіне яшчэ няшмат людзей маюць біяметрычныя дакументы або іншыя сродкі ЭЛП, без якіх немагчыма ідэнтыфікавацца на партале для атрымання паслугі, таму найчасцей анкеты запаўняюць усё ж урачы, да якіх чалавек асабіста прыйшоў на прыём. Калі грамадзянін захоча прайсці лічбавую дыспансерызацыю сам, ён можа аўтарызавацца на партале, выбраць у асабістым кабінеце катэгорыю «Ахова здароўя» і перайсці да паслугі 3.65.01. Пасля запаўнення анкеты файл з адказамі накіроўваецца ў электронны кабінет установы аховы здароўя, якую абярэ сам чалавек (з прапанаванага ў паслузе спіса) незалежна ад месца яго жыхарства і рэгістрацыі,* — распавяла Святлана Караневіч.

І пачнём з самых магутных міфалагічных істот — цмокаў, то-бок драконаў. У Мінску яны жылі ў двух відах, але абодва звязаныя з ракой Свіслач. Адзін цмок — класічны, пыхкаў агнём, жыў у пячоры ў гары ў раёне сённяшняй Юбілейнай плошчы, харчаваўся прыгажунямі... Быў забіты адважным рыцарам, косткі кінутыя ў Свіслач, і нібыта іх можна было пабачыць скрозь каламутныя хвалі ракі насупраць сучаснага гатэля «Юбілейны». Другія цмокі — больш рэалістычныя. У XVII стагоддзі барон Сігізмунд Герберштэйн, які праязджаў праз наш горад, занатаваў, што мінчане ў якасці хатніх жывёл трымаюць у сваіх дамах тоўсценькіх яшчарак з кароценькімі ножкамі і чорнай бліскучай лускою, вылаўленых у Свіслачы. Наколькі можна зразумець, рэліктавыя істоты былі велічынёй з кошку, і чучала такой яшчаркі ўпрыгожвала кабінет дырэктара адной з мінскіх рэальных вучэльняў, бацькі беларускага публіцыста Уладзіміра Самойлы, яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Так што ўглядзьцеся пры выпадку ў воды Свіслачы — раптам бліснуць залатыя вочы, мільгане чорны хвост.

### РУСАЛКІ

Русалка ў горадзе таксама не адна. І легенда не адна. Дзве з легенд звязаныя зноў-такі са Свіслаччу.

Ганарыстая дзяўчына выбірала паміж двума кавалерамі, усё па класіцы: адзін прыгожы, але бедны, другі пачварны, але багаты. Выбраць не магла, абодвух абнадзейвала... Пакуль бедны, але прыгожы не прыйшоў да каханай з кветкамі ды не пабачыў яе ў абдоймах багатага саперніка. Кажуць, схапіў падступную ў абдымкі ды разам з ёю — бух у Свіслач...

Другая русалка з'явілася яшчэ больш трагічна: наняў багаты шляхцюк да трох дачок хатняга настаўніка... Усе тры ў маладога чалавека і закахаліся. А ён абраў малодшую і нават намовіўся яе звезці якраз перад балем, куды сямейства павінна было выпраўляцца. Сёстры даведаліся, замкнулі саперніцу ў падвале і паехалі на баль, да бацькі... А быў час паводкі — Свіслач і Няміга рэчкамі былі нараўістымі, непакорлівымі, увесь цэнтр горада затаплівалі... Вось бедная дзяўчына ў сутарэнні тым і захлынулася.

Абедзве русалкі з'яўляюцца самотным мінакам у раёне Зыбіцкай вуліцы і Траецкага прадмесця, палохаюць, могуць і патапіць... Толькі, падобна, адна больш не любіць мужчын, а другая — жанчын. А калі хочаце палюбавацца на матэрыяльнае ўвасабленне тых інфернальных істот — наведайце «Дом з русалкамі», які знаходзіцца ля метро «Трактарны завод» — калісьці ў ім давалі кватэры стаханаўцам, цяпер ён знакаміты адмысловай ляпнінай, што выяўляе міфічных водных істот.



### ГОЛУБ ЦІ ПТУШКА-ВЯШЧУННЯ

13 жніўня 1500 года, яшчэ сонца не ўзышло, менчукі збегліся на бераг Свіслачы ля Ніжняга рынку: адтуль праменіла дзіўнае святло. Аказалася, да берага прыбіла цудоўны абраз з выявай Божай Маці з Немаўлём. Той абраз цудоўным чынам прыплыў супраць цячэння ракі з захопленага татарамі Кіева — адзін з захопнікаў шпурнуў святыню ў ваду.

Цяпер на тым месцы знаходзіцца помнік у гонар знаходжання абраза — на абеліску, які сімвалізуе воды ракі, сядзіць белая птушка з выявай іконы.

Звычайна месцічы лічаць, што гэта голуб. Самая звыклая гарадская птушка. Цяжка ўявіць наш горад без яе. Чытала, што пасля вайны, калі галубоў на вуліцах вызваленай беларускай сталіцы амаль не стала — бо і птаства закранула ваеннае ліхалецце, гараджане, якім не хапала сімвалаў мірнага жыцця, прывезлі іх з Рыгі. І цяпер непадалёк ад месца аднойдзення абраза, ля Свята-Духава кафедральнага сабора, паміж ліхтароў, што імітуюць свечкі, круглы год збіраюцца зграі мінскіх галубоў, і шызых, і белых — унізе станцыя метро, відаць, тут ім цяплей... Дый каля царквы людзі міласэрныя часцей падкормліваюць.

Але са скульптурай усё яшчэ складаней... Аказваецца, аўтары задумалі, што на абеліску сядзіць не проста птушка, а Птушка-вяшчунння, якая да таго ж павінна нагадваць ладдзю. Але ніхто не перашкодзіць нам па-ранейшаму бачыць у выяве белага лагоднага голуба птушку нябесную, якая ахоўвае мірнае жыццё. Ну а абраз Маці Божай Мінскай, напісаны, паводле легенды, самім апосталам Лукою, знаходзіцца ў кафедральным саборы, што побач.

### ХЛОПЧЫК І ЛЕБЕДЗЬ

Няма, мабыць, мінчаніна, які, пачуўшы словы «хлопчык з лебедзем», не ўявіць мілай скульптуры фантана ў Аляксандраўскім скверы... Хлопчык з лебедзем з'явіўся ў Мінску яшчэ ў 1874 годзе, у гонар адкрыцця водаправода. Гордыя рарытэтам гараджане прыпісалі аўтарства скульптуры знакамітаму італьянскаму майстру Бярніні. Але з'явілася яна нашмат пазней за сямнаццатае стагоддзе, калі стварыў свае шэдэўры італьянец. А гісторыя яе з'яўлення такая... У 1851 годзе на выставе ў Лондане паказаў свайго «Хлопчыка, які гуляе з лебедзем» скульптар Тэадор Калідэ, за што атрымаў медаль і процьму замоў на копіі, прычым у самых славутых месцах накшталт каралеўскіх палацаў. Замовілі скульптуру і для Мінска.

Мінскі хлопчык з лебедзем стаў сімвалам трывушчасці... Што толькі з ім ні здаралася! Калісьці ў струмені, які б'е з горла лебедзя, скакаў мячык, і выходзіла, што хлопчык і лебедзь перакідваюцца ім. Але сакрэт таго фокуса быў страчаны, і пра мячык даўно не ўспамінаюць. У вадзе вакол пастамента плавалі залатыя рыбкі і чарапахі і цвілі лілеі. На парапеце аднойчы з'явіліся бронзавыя жабкі, якія на дзесяцігоддзі зніклі, пасля зноў з'явіліся. Галаву лебедзя адломвалі, зноў прыладжвалі... Аднойчы фігуры пазалацілі, відаць, каб «па-багатаму». Вада то біла з фантана, то знікала. Зрэшты, нават у 1887 годзе ў газеце «Мінскі лісток» наракалі: «Фонтан в сквере раньше работал чаще, и в водоеме плавали рыбы и черепахи, а теперь чугунный лебедь с мальчиком зря открывает свой клюв». Нават над назвай эксперыментавалі. Хлопчыка дасціпнікі празвалі Панікоўскім, а лебедзя — гусем па аналогіі з героем рамана Ільфа і Пятрова — махляром Панікоўскім, аматарам красці гусей... Але фантан, які сам зрабіўся ўжо легендай, усё перажыў і радуе гараджан і гасцей горада. Кінуць манетку ў яго, вядома, — на шчасце.



### КОНЬ І ВЕРАБЕЙ

Ёсць у мінчан і яшчэ адна казачная птушка, якая прыносіць шчасце. І гэта... верабей. Праўда, не простая шэрая дробная істотка, а птах-вершнік. Ён сядзіць на спіне бронзавага каня, які цярпліва чакае і чакае каля Камароўскага рынку прыязнага гаспадара, падобна парнакапытнаму Хаціка. Скульптуру зрабіў скульптар Уладзімір Жбанаў, які стварыў і губернатарскі экіпаж каля мінскай Ратушы, і Даму з сабачкам каля той жа Камароўкі, і шмат яшчэ дарагіх сэрцу мінчука скульптур. Прабобразам камароўскага каня стала прыгажуня Эксперыза з Ратамкі. Але не гэтая фігура стала галоўнай для мінакоў, а маленькі бронзавы верабейчык, які сядзіць на яе спіне. У яго таксама ёсць прататыпы — кажуць, скульптар, каб яго стварыць, блукаў па беразе той жа Свіслачы і замалёўваў вераб'ёў. Калі будзе праходзіць міма, звярніце ўвагу, як блішчыць верабейчык, ажно зззяе на сонцы. Бо ўсе ведаюць: калі ўзлезці на каня і пацерці бронзавую птушачку, абавязкова пашанцуе. А на любым рынку як без шанцавання?



### САВА, ДЗЯЎЧЫНКА І ПАПАРАЦЬ

Адна з улюбёных беларусамі легенд — пра цвіценне ў Купальскую ноч папараць-кветкі. Пераадолееш свае страхі перад начнымі ляснымі зданямі, сарвеш агністы квет — зможаш разумець звяроў і птушак, бачыць скрозь зямлю скарбы... Матыў папараць-кветкі ў Мінску сустракаецца часта, напрыклад, у фантане каля музея Янкі Купалы. А вось у Траецкім прадмесці нядаўна з'явілася адмысловая скульптура аўтарства скульптара Зільбера, дзе ліст папараці, на якім расцвітаюць тры кветкі, трэба не рваць, а гладзіць. На папараці стаіць дзяўчынка, за яе плячом крыляе сава, ля ног сядзіць яшчарка. Камянёў каля пастамента таксама тры. І вось турысты з дапамогай гідаў разгадваюць патаемныя сэнсы скульптуры і націраюць да бляску папараць, каб займець мудрасці, славы або багацця.

Гэта толькі маленькая частка мінскіх легендаў. Будзеце хадзіць па вуліцах нашага любімага горада, углядацца, услухоўвацца ў яго таямніцы — даведаецеся яшчэ шмат цікавага.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



Запрашальнік

# Дню нараджэння Коласа прысвячаецца

**Па традыцыі чарговы дзень нараджэння народнага песняра Беларусі Якуба Коласа будзе адзначаны шэрагам урачыстых мерапрыемстваў і ў лістападзе 2023 года.**



3 лістапада а дзясятай гадзіне раніцы пройдзе ўскладанне кветак да помніка Якубу Коласу ў сталіцы на плошчы, якая носіць імя класіка айчыннай літаратуры. Праз гадзіну ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа пачнецца XXXVII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Каласавіны-2023», прысвечаная 100-годдзю напісання паэмы «Новая зямля». У гэты ж дзень у музеі адкрыецца часовая экспазіцыя, прысвечаная легендарнай паэме. А 16-й гадзіне гасцям Коласавага дома будзе адрасавана літаратурна-музычная праграма народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

— Спяшаюся пераканаць усіх аматараў творчасці народнага песняра, — зазначае **дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірына МАЦЯС**, — што будзе цікава і на канферэнцыі, і пры знаёмстве з новай экспазіцыяй. Акрамя ўсяго астатняга, да свята мы падрыхтавалі і новыя кніжныя праекты. Пазнаёміцца з імі можна будзе не толькі ў святочныя дні. Колас па-ранейшаму застаецца сучасным і блізкім да нас, да нашага сённяшняга жыцця.

А 4 лістапада ўрачыстасці прадоўжацца на Стаўбцоўшчыне. Госці святкавання ўскладуць кветкі да помніка Якубу Коласу ў Стоўбцах. Пасля будуць арганізаваны экскурсіі ў мемарыяльныя сядзібы «Мікалаеўшчына», «Акінчыцы», «Альбуць», «Смольня».

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Спяшайцеся бачыць

# Куцейна — духоўная скарбніца



**У музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі адкрылася выстаўка «Кніжныя скарбы Куцеінскага манастыра», прымеркаваная да 400-годдзя з дня заснавання на Віцебшчыне Свята-Багаяўленскага храма.**

Гігін заўважыў, што манастыр, нягледзячы на тое, што ствараўся ў вельмі няпросты час, адыграў вялікую ролю ў асветніцкай справе, захаванні духоўных каштоўнасцяў, а супрацоўнік Мінскай духоўнай акадэміі Аляксей Дзмідаў распавёў пра гісторыю праваслаўнага цэнтра.

У XVII стагоддзі ён стаў адным з найбуйнейшых асветніцкіх і культурных цэнтраў. Пры манастыры працавалі выдатныя майстры — разьбяры па дрэве, вырабе чаканкі, іканапісцы. Была тут і шыкоўная бібліятэка, дзе захоўваліся друкаваныя і рукапісныя кнігі.



Але найбольшую вядомасць Куцеінскаму манастыру прынеслі друкары. Пры праваслаўным манастыры ў 1630—1654 гады працавала друкарня, дзе выдавалася навукова-асветніцкая, царкоўна-палемічная і свецкая літаратура на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. У ёй у 1631 годзе выйшаў і знакаміты буквар Спірыдона Собаля. Арыгінала старажытнага падручніка, на жаль, у Беларусі няма, але ў музеі кнігі сёння можна пабачыць факсімільнае выданне буквара, здзейсненае ў 2014 годзе.

На адкрыцці выстаўкі генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім

У музеі кнігі прадстаўлены рарытэты, як выдадзеныя ў Куцеінскай друкарні, так і тыя, што захоўваліся пры манастыры, пра што сведчаць запісы, зробленыя на кнігах.

На часовай выстаўцы экспануюцца рукапісны помнік — Сінодзік Куцеінскага манастыра XVIII стагоддзя, узор перакладной літаратуры «Гісторыя пра Варлаама і Іасафа», «Актоіх Іаана Дамаскіна», адно з цудоўных літургічных выданняў «Трэфалагіён» і іншыя экспанаты. Прадстаўлены шэраг кірылічных выданняў і рукапісаў XVII—XVIII стагоддзяў з запісамі Куцеінскага манастыра. Сярод іх — рукапісныя ноты «Ірмалогій» XVII стагоддзя, маскоўскія і кіеўскія богаслужэбныя старадаўнія гравюры. Таксама ў экспазіцыі — дакументы, звязаныя з гісторыяй Куцеінскага манастыра.



**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# Дакрануцца да спадчыны душой

### У Мінску праходзіць выстава, прысвечаная нематэрыяльным каштоўнасцям

**Сёлета Міністэрствам культуры Беларусі сумесна з мясцовымі органамі ўлады і ўстановамі культуры быў распрацаваны і паспяхова рэалізоўваецца план мерапрыемстваў па святкаванні 20-годдзя Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У рамках дадзенага плана Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур рэалізаваў маштабны праект «Дакрануцца да спадчыны душой». Экспазіцыя працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы.**



— На аснове матэрыялаў дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, такіх як Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і «Жывая спадчына», мы сістэматызавалі даныя і сфарміравалі выставу, — адзначае **Вольга ЯКАБСОН, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.** — Сама назва выразна адлюстроўвае сутнасць створанага праекта. Калі мы апрацоўвалі велізарную колькасць інфармацыі, фотаматэрыялы, сапраўды дакраналіся да спадчыны душой. Усё, што прадстаўлена на гэтай выставе, — наша ўнікальная беларуская спадчына.

Мэта — расказаць пра багацце і разнастайнасць нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. На 25 стэндах прадстаўлены нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі, у тым ліку беларускія элементы ЮНЕСКА.

На стэндах можна ўбачыць элементы абрадаў і святкаванняў, традыцыі, праявы светапогляду і міфалогіі, веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі, элементы беларускай кухні, прычым гэта прадстаўлена ўсімі рэгіёнамі нашай краіны. Беларусаў не пакінуць абыякавымі маляваныя дываны, саламяныя павукі, традыцыйныя выцінанкі і выбіванкі.

Пасля паказу ў Мінску выстава адправіцца ў падарожжа па ўсіх рэгіёнах Беларусі, каб жыхары ўсіх яе куткоў маглі ўбачыць нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці краіны.

Праект выклікае вялікую цікавасць у нашых суайчыннікаў за мяжой. Гэтая выстава ўжо перакладзена на рускую мову, а таксама існуе яе электронны макет: у планах знаёмства з нашай гісторыка-культурнай спадчынай жыхароў розных рэгіёнаў Расіі.



**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



## ПЛЕЩЕНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 29 ноября 2023 г. открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения в г. п. Плещеницы Логойского района Минской области**

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения** | | | | | | |
| 1 | **Минская область, Логойский район, г. п. Плещеницы, ул. Высокая, 1,** земельный участок с кадастровым номером 623255700001002203, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,0960 | Возможность подключения к электроэнергии, водоснабжению | 9 500,00 | *публикация в газете + 213,00 руб.* | 950,00 |
| 2 | **Минская область, Логойский район, г. п. Плещеницы, ул. Шутта, 51,** земельный участок с кадастровым номером 623255700001001991, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом) | 0,1003 | Возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению, имеется подъездная грунтовая дорога | 11 500,00 | *публикация в газете + 213,00 руб.* | 1 150,00 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY51AKBB36006191511080000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X в г. Логойск, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Плещеницкий сельский исполнительный комитет.

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предъявить документ удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией на земельные участки с незавершенными незаконсервированными капитальными строениями, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **29 ноября 2023 г. в 10.00** по адресу: г. п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, д. 7, актовый зал. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. п. Плещеницы, ул. им. В.И. Ленина, д. 7.

Последний день приема заявлений 27 ноября 2023 г. до 17.00.

Контактные телефоны: (801774) 22165, 22335, +375291537313.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

**ОАО «БПХО» (Продавец)**

**Аукцион состоится 17.11.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

**Лот № 1, состав:** 1. Ремонтно-строительный цех, инв. № 110/С-86164, 2307,7 кв. м. 2. Здание склада РСЦ, инв. № 110/С-102697, 200,1 кв. м. 3. Закрытый склад РСЦ, инв. № 110/С-102693, 628,2 кв. м. 4. Автостоянка, инв. № 110/С-102634, 2603 кв. м. 5. Гараж на три автомашины, инв. № 110/С-102636, 187,4 кв. м. 6. Пост охраны № 8, инв. № 110/С-102583, 3,9 кв. м. 7. Благоустройство РСУ, инв. № 110/С-111836, 8818 кв. м. 8. Трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ, инв. № 110/С-111717, 80,4 м. 9. Трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ, инв. № 110/С-111758, 179,4 м. 10. Участок канализационной сети от РСУ до КК-116, инв. № 110/С-111721, 187,6 м. 11. Кабельная линия КЛ 0,4 кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка», инв. № 050009, 245,6 м. 12. Кабельная линия КЛ 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ», инв. № 050007, 122,5 м. 13. Кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама», инв. № 050008, 128 м. **Адрес** лота № 1: Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В; 13В/1; 13В/2; 17; 13Б/1; 13Б/2; 7, благоустройство РСУ; 7, трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ; 7, трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ; 7, участок канализационной сети от РСУ до КК-116; 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка»; 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ»; 7, кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама». Начальная цена с НДС 20 % – 663 762,95 руб. Задаток – 100 000,00 руб. Земельный участок 141000000006002693, 1,8890 га, право арены по 22.08.2046. Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков 15.11.2023 в 11.00

**☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Извещение о проведении 17 ноября 2023 года повторных публичных торгов № 02-ННО-23 по продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта

| Сведения о предмете аукциона | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение предмета аукциона | Кадастровый номер земельного участка | Площадь (га) | Вид права на земельный участок / срок аренды | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
| г. Минск, ул. Казимировская, 12 | 500000000006011130 | 9,2770 | Право аренды на земельный участок / 5 лет | Для завершения строительства и обслуживания объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения | 96 973 558,55 (в том числе: начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске» в соответствии с оценочной стоимостью в размере 96 399 207,88 бел. руб., начальная цена права аренды земельного участка площадью 9,2770 га в размере 574 350,67 бел. руб. с учетом предоставления земельного участка сроком на 5 лет | 9 600 000, 00 |

Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома «О создании земельного участка для проведения аукциона» от 16.08.2023 № 3326 (далее – решение № 3326), и иные условия аукциона:

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее 3 месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, обратиться за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;
- в месячный срок с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на предоставленный земельный участок приступить к разработке проектной документации на строительство объекта. Срок ее разработки, с учетом положительной государственной экспертизы, не должен превышать 2 лет с даты государственной регистрации прав и ограничений (обременений) прав на предоставленный земельный участок;
- в течение месяца с момента получения положительного заключения государственной экспертизы утвердить проектную документацию на строительство объекта в установленном порядке;
- в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка);
- обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель, своевременно вносить арендную плату;
- не передавать земельный участок в пользование, аренду другим организациям и гражданам, не нарушать прав смежных землепользователей.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона принять к сведению:
- до осуществления победителем аукциона государственной регистрации возникновения прав на предоставленный земельный участок, земельный участок будет использоваться в городском хозяйстве г. Минска;
- расходы по оценке не завершенного строительством незаконсервированного объекта «Спортивно-оздоровительный и торгово-развлекательный центр на пересечении ул. Казимировской – ул. Каменногорской в г. Минске» составляют 46 248,00 бел. руб.;
- в случае отсутствия разработанной и утвержденной в установленный срок проектной документации, Мингорисполкомом будет инициирована процедура изъятия земельного участка;
- в случае неосвоения земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения проектной документации Мингорисполкомом будет инициирована процедура изъятия земельного участка

**Продавец предмета аукциона:** Минский городской исполнительный комитет, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 8, тел.: + 375 (17)317 16 66, + 375 (17) 326 69 66.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.10, тел. + 375 (17) 363-96-72.

Форма публичных торгов: открытый аукцион (на повышение начальной цены).

Предмет аукциона: не завершенный строительством незаконсервированный объект и право аренды земельного участка, необходимого для завершения строительства и обслуживания этого объекта, составляющие единый предмет аукциона.

Аукцион состоится **17 ноября 2023 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7.

Прием заявлений на участие в аукционе и прилагаемых к ним документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2 **с 31 октября 2023 г. по 15 ноября 2023 г.** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 16.30). Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением о продаже не завершенного строительством незаконсервированного объекта с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 № 370 «О некоторых мерах по реализации Декрета Президента Республики Беларусь от 12 ноября 2015 г. № 8».

Участниками аукциона могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства), если иное не установлено законодательными актами. На стороне покупателя допускается участие консолидированных участников: двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц (далее – консолидированные участники).

**Порядок оформления участия в аукционе:**

Организатору аукциона в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Задаток по соответствующему предмету аукциона перечисляется в срок, установленный для приема документов, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 02-ННО-23;

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, документ, удостоверяющий личность, в случае, когда юридическое лицо представляет его руководитель, – документ, подтверждающий его полномочия;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность, документ, удостоверяющий личность;

представителем иностранного юридического лица, иной иностранной организации, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном порядке, с переводом на белорусский или русский язык, верность которого или подлинность подписи переводчика которого должна быть засвидетельствована нотариально, документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе, в случае, когда интересы консолидированных участников представляют иные лица.

К участию в аукционе допускаются лица, перечисленные в настоящем извещении, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение.

**Порядок определения победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона):**

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики не завершенного строительством незаконсервированного объекта, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона. Шаг аукциона определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены предмета аукциона. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от начальной цены предмета аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Если по объявленной аукционистом цене предмета аукциона аукционные номера подняли два участника аукциона и более, аукционист объявляет новую цену предмета аукциона в соответствии с шагом аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

**Сведения об обязанности победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона):**

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона несостоявшимся:

- внести плату за право аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Мингорисполкому затраты на формирование земельного участка в размере 8 748,47 бел. руб.;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись);
- выполнить условия, предусмотренные в решении № 3326, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) указанных действий и представления организатору аукциона и в Мингорисполком копий платежных документов, **но не позднее двух рабочих дней**, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом (Мингорисполкомом) заключается договор купли-продажи не завершенного строительством незаконсервированного объекта и договор аренды земельного участка.

В тот же срок Мингорисполком передает победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) выписку из решения № 3326 и выдает экземпляр протокола.

**Дополнительная информация:** Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «Продажа /Аренда имущества»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «Земля и имущество»/«Продажа /Аренда/в отношении земельных участков), организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Земельные участки» и «Недвижимость в собственность»).

Телефон для справок: + 375 (17) 363 9672 (по вопросам проведения аукциона), +375 (17) 317 16 66, +375 (17) 326 69 66 (по вопросам осмотра предмета аукциона).

Спорт-тайм

# Беларускія барцы заваявалі пяць медалёў маладзёжнага чэмпіянату свету

**У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем важныя спартыўныя навіны**



**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** У сталіцы Албаніі Тыране завяршыўся чэмпіянат свету па барацьбе сярод атлетаў да 23 гадоў, удзел у якім пад нейтральным сцягам прынялі беларускія спартсмены. Барэц грэка-рымскага стылю Павел Глінчук стаў чэмпіёнам свету ў вагавой катэгорыі да 97 кг. Глеб Макаранка стаў сярэбраным прызёрам у катэгорыі да 63 кг. Не засталіся без медалёў і дзяўчаты. Аліна Шаўчук заваявала «серабро» ў катэгорыі да 68 кг, а Арына Мартынава і Вікторыя Радзькова выйгралі па «бронзе» ў катэгорыях да 55 кг і да 72 кг адпаведна.

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Хакеісты мінскага «Дынама» завяршылі чарговую выязную серыю ў рэгулярным чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі. У заключным матчы серыі «зубры» сустрэліся з омскім «Авангардам». Вынік сустрэчы — 4:3 на карысць мінчан. Такім чынам, у гэтай выязной серыі падапечныя Дзмітрыя Квартальнага набралі чатыры ачкі з чатырох. Наступны паядынак мінчане правядуць 31 кастрычніка на дамашнім лёдзе супраць чарапавецкай «Паўночнасталі».

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** 6 залатых медалёў заваявалі беларускія спартсмены на маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64, які адбыўся ў Турцыі. Двухразовай чэмпіёнкай свету сярод моладзі стала Аляксандра Спірына. Па залатым медалі таксама выйгралі Арцём Ціханаў (юніёры) і Паліна Петрусева (моладзь), Дар'я Нікіфарава (дзяўчаты да 17 гадоў) і Юлія Швед (дзяўчаты да 11 гадоў). Яшчэ сем беларусаў сталі прызёрамі чэмпіянату. У маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64 прынялі ўдзел 160 спартсменаў з 13 краін. Спаборніцтвы праходзілі ў шасці ўзроставых групах па трох праграмах — класічнай, хуткай і вокамгненнай. Беларускія спартсмены заваявалі 6 залатых, 5 сярэбраных і 7 бронзавых медалёў.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Нашы спартсмены выступілі на Усерасійскіх спаборніцтвах па веласпорце на трэку, якія завяршыліся ў Санкт-Пецярбургу. Усяго наша каманда заваявала шэсць медалёў. У індывідуальнай гонцы праследавання на тры кіламетры сярод жанчын з новым рэкордам Беларусі — 3:29,394 — перамагла Караліна Бірук, другое месца заняла Анастасія Колесава. У юніёрак поўны камплект узнагарод сабрала Паліна Конрад: «золата» ў гонцы з выбываннем, «серабро» ў гонцы праследавання і «бронзу» ў мэдысане ў дуэце з Адэлінай Сакун. Акрамя таго, Сакун заваявала бронзавы медаль па выніках скрэтча.

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Беларускія футбалісты прабіліся ў элітны раўнд адбарачнага турніру юнацкага чэмпіянату Еўропы (U-17). У заключным матчы кваліфікацыйнай групы беларуская зборная сустрэлася з камандай Казахстана. Паядынак скончыўся нічыёй — 0:0. У першым туры беларусы перамаглі каманду Шатландыі — 3:1, а потым саступілі зборнай Турцыі — 0:1. Выніковае становішча ў групе: Турцыя — 7 ачкоў, Беларусь — 4, Шатландыя — 3, Казахстан — 2. У элітны этап кваліфікацыі юнацкага кантынентальнага першынства выходзяць па дзве найлепшыя каманды з 13 груп, а таксама пяць найлепшых зборных, якія фінішуюць трэцімі. Пуцёўкі туды, акрамя беларусаў і туркаў, ужо атрымалі футбалісты Грузіі, Германіі, Польшчы, Аўстрыі, Нідэрландаў, Швецыі, Фінляндыі, Ірландыі і Швейцарыі. Матчы элітнага раўнда адбору пройдуць у сакавіку, а фінальны турнір адбудзецца з 20 мая да 5 чэрвеня 2024 года на футбольных арэнах Кіпра.

**ДЭБЮТ ГОДА.** Беларускі абаронца Ілья Салаўёў правёў першы ў кар'еры матч у Нацыянальнай хакейнай лізе. Беларускі хакеіст выступае ў складзе каманды «Калгары Флэймз». Ураджэнец Магілёва стаў 15-м беларускім хакеістам у бягучым сезоне, які выступае ў наймацнейшай лізе планеты. Разам з Салаўёвым за «Калгары Флэймз» выступае яшчэ адзін беларус Ягор Шаранговіч. Упершыню за 11 гадоў за адну каманду НХЛ згулялі два беларусы. Але ў гэтым матчы «Калгары» прайграў «Сэнт-Луісу» з лікам 0:3.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.07 | 17.39 | 9.32 |
| Віцебск — | 8.00 | 17.24 | 9.24 |
| Магілёў — | 7.57 | 17.29 | 9.32 |
| Гомель — | 7.50 | 17.30 | 9.40 |
| Гродна — | 8.21 | 17.54 | 9.33 |
| Брэст — | 8.18 | 17.59 | 9.41 |

### Месяц

*Поўня 28 кастрычніка. Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр. Златы, Андрэя, Іосіфа, Сяргея, Юльяна. К. Антаніны, Аўгуста, Лукі, Урбана.*



Фота Ірыны СІДАРОК.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 31 КАСТРЫЧНІКА

У краіне



**1912** год — нарадзіўся (цяперашні Лоеўскі раён) Дзмітрый Кузьміч Марозаў, Герой Савецкага Саюза (1945). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941-га — на Паўночна-Заходнім, Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі (1944). Падчас прарыву абароны ворага на паўднёва-ўсход ад Віцебска ў чэрвені 1944-га стралковы полк пад камандаваннем палкоўніка Марозава авалодаў вёскай Буракі, чым садзейнічаў наступленню савецкіх войскаў; фарсіраваў рэкі Лучоса, Бярэзіна, у ліпені — Вілію і Нёман. Удзельнік вызвалення Вільнюса, Каўнаса, штурму Кёнігсберга, разгрому Квантунскай арміі Японіі ў складзе 1-га Далёкаўсходняга фронту.

**1943** год — 31 кастрычніка — 1 лістапада адбыўся бой першай Антыфашысцкай партызанскай брыгады (камандзір Уладзімір Гіль-Радыёнаў) супраць нямецка-фашысцкага гарнізона ў Вілейцы, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Вілейскі бой. Партызаны (каля 1000 чалавек) 31 кастрычніка пад прыкрыццём агню сваёй артылерыі раптам атакавалі горад. У начным баі яны знішчылі 120 акупантаў і іх памагатых, узарвалі і спалілі чыгуначную станцыю, лесапільны завод, млын, воданапорную вежу, тры трактары, чатыры цыстэрны з гаручым, 10 розных саставаў, чатыры чыгуначныя і чатыры шашэйныя масты.

**1968** год — Аркадзю Куляшову і Максіму Танку прысвоены званні народных паэтаў Беларусі.

**1973** год — у Мінску адкрыты Палац мастацтва — выставачны павільён выяўленчых мастацтваў.

У свеце

**1517** год — манах ордэна аўгусцінаў, выкладчык універсітэта Марцін Лютэр выступіў у Вітэнбергу з 95 тэзісамі супраць каталіцкага вучэння пра адпушчэнне грахоў і індульгенцыю, што паклала пачатак падзелу заходнееўрапейскага хрысціянства на каталіцкую і евангелісцкую цэрквы.

**1896** год — нарадзіўся Венедыкт Венедыктавіч Пушкоў, рускі кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі.

**1811** год — быў адкрыты Імператарскі Аляксандраўскі (Царскасельскі) ліцэй, які даў Расіі плеяду выбітных дзеячаў культуры, мастацтва і палітыкі.



**1918** год — СНК зацвердзіў Палажэнне аб сацыяльным забеспячэнні працоўных.

**1922** год — нарадзіўся Анатоль Дзмітрыевіч Папанаў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Так гаварыў...

**ЛАФАТЭР:**

*«Ніколі не кажыце, што ведаеце чалавека, калі не дзялілі з ім спадчыну».*

## УСМІХНЕМСЯ

**З раніцы прачнуўся — нічога не баліць, тэмпературы няма, суставы не ломіць. Патэлефанаваў на работу, сказаў, што не прыйду, у мяне бессімптомны грып.**

Парада для маладых.

Адпраўце запрашэнне на вяселле кожнаму мільярдэру, чый адрас зможаце знайсці, таму што з верагоднасцю 50/50 іх памагатыя проста дашлюць вам фармальны падарунак, нават не задаючыся пытаннем, хто вы такія.

**Раздражняе, калі ў цябе экзістэнцыяльны крызіс, а ты не можаш выгаварыць гэтае слова.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.544. Індэкс 63850. Зак. № 2462.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 кастрычніка 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12